№ 42 – 43 (815 – 816)
Лістапад 2020 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
kazeta.by bfk.by

## У нумары:

Форум: *даклады В. Сцяпанава і Б. Мухі* – *стар. 4 і 5*

Год радзімы: *сваякі і мясціны на фота і відэа* – *стар. 6*

«Па-за кадрам»: *пра людзей адукаваных і паважаных* – *стар. 9 і 10*




# І чытанні, і альманахі...

***13-я Лунінецкія краязнаўчыя чытанні прайшлі ў цэнтральнай бібліятэцы гэтага палескага райцэнтра. Па шэрагу прычынаў яны былі не такімі шматлюднымі, як у папярэднія гады, але многія краязнаўцы прынялі ў іх удзел завочна, даслаўшы матэрыялы для публікацыі.***

Кіраўнік Лунінецкага краязнаўчага таварыства Вадзім Жылко нагадаў пра творчыя здабыткі мясцовых даследчыкаў за год пасля папярэдніх чытанняў. Летась у снежні раённая бібліятэка і краязнаўчае таварыства выпусцілі зборнік «Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны – 2» (першы выпуск альманаха выйшаў у 2017 годзе). Тады ж краязнаўчыя працы лунінчанаў былі надрукаваныя ў абласным пісьменніцкім альманаху «Жырандоля» (№ 11) і ў кнізе «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання. Матэрыялы і даклады IV міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі».

Сёлета ў студзені адбылося пасяджэнне Лунінецкага краязнаўчага таварыства, прысвечанае 80-годдзю раёна.

У Мінску 12-13 сакавіка ў секцыях I Рэспубліканскага краязнаўчага форуму Беларусі з дакладамі выступілі лунінчане Надзея Цяльпук, В. Жылко, Галіна Антановіч, Дзіяна Сладзінская, Тацццяна Канапацкая, Ягор Скрыбка. За перамогі ў асобных намінацыях конкурсу краязнаўчай літаратуры журы ўзнагародзіла дыпломамі Івана Панасюка, В. Жылко, Т. Канапацкую, Лунінецкі райвыканкам і яго ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

У верасні Лунінецкае краязнаўчае таварыства было адзначанае дыпломам за ўдзел у фестывалі «Флер'яноўскія чытанні» (Ляхавіцкі раён).

В. Жылко таксама зрабіў агляд краязнаўчых публікацыяў на старонках перыядычных выданняў, і не толькі рэгіянальных.

Лілія Віўдзенка прадставіла даследаванне па гісторыі Мікашэвічаў, якое звязанае з мясцовым касцёлам, падзеямі часоў вайны і іншымі тэмамі.

Кіраўнік аб'яднання «Краязнаўства» політэхнічнага каледжа Г. Антановіч пазнаёміла з творчымі здабыткамі сваіх вучняў і калегаў.

Сцяпан Нефідовіч распавёў пра даследаванні тапанімікі, фальклору, гісторыі Лунінеччыны, пра свае сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі, якія наведвалі гэты край.

* * *

Неўзабаве пасля чытанняў пабачылі свет некалькі новых выданняў, прысвечаных Лунінеччыне.

Гэта найперш альманах «Лунінецкі сшытак» (№ 19-20). Яго змест склалі артыкулы В. Жылко «У няспынным творчай працы» (агляд дзейнасці мясцовых даследчыкаў за апошнія два гады), Л. Віўдзенка «Микашевичи “постарели” на 49 лет» і «Из истории школьного образования в Микашевичах», Ганны Дземідовіч «Ніхто не забыты (З архіўных дакументаў)», Віктара Місіюка «Канструктар з Лунінца» («Турбіны на Гарыні»), С. Нефідовіча «Цячэ рэчанька, невялічанька...», Алены Нямчэні «Польский период» в истории Микашевичей», Святаслава Яначкіна «Как поляки с китайцами за Лунинец воевали» (пра падзеі 1919 года на савецка-польскім фронце).




Таксама выдадзеныя два спецвыпускі «Лунінецкага сшытка». У № 9 змешчаны артыкул С. Яначкіна «Столетие присвоения Лунинцу статуса города (1919 – 2019), или Большая игра вокруг маленького полесского города», у № 10 – артыкул таго ж аўтара «Когда Лунинец был Лондоном» (пра актыўную дзейнасць на Палессі ў 1920-я гады Польскай сацыялістычнай партыі).

*Віталь ДЫМАЎ, фота аўтара*

*Сябры! Падпісацца на «Краязнаўчую газету» можна да 25 чысла любога месяца. Не забывайцеся, што ідзе падпіска на 1-е паўгоддзе 2021 года. Калі ласка, не адкладайце на апошнія дні паход на пошту. Будзьма разам!*

## Нашы спачуванні



Нацыянальнае мастацтва нашай краіны панесла цяжкую страту. Пайшоў з жыцця мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, прафесар **Міхась Паўлавіч ДРЫНЕЎСКІ**.

Ён быў адным з самых выбітных дзеячаў беларускага музычнага і харавога мастацтва, багата адораны фалькларыст і этнограф, аранжыроўшчык і выдатны дырыжор. Нарадзіўшыся ў знакамітай вёсцы Тонеж на Палессі, ён з дзяцінства палюбіў народную песню, атрымаў грунтоўную музычную адукацыю ў Гомельскім музычным вучылішчы і Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, пераняў з рук у рукі ад Генадзя Цітовіча здабыткі і традыцыі Дзяржаўнага народнага хору БССР і пакінуў пасля сябе ўнікальны мастацкі калектыў як сапраўдны эталон нацыянальнага мастацтва і прыгожую візітоўку сучаснай Беларусі.

Без удзелу Нацыянальнага хору і яго мастацкага кіраўніка не абыходзіліся ніводзін фестываль і конкурс альбо іншы творчы праект у нашай краіне; калектыў годна і прыгожа прадстаўляў Беларусь больш як у 20-і краінах свету.

Міхась Паўлавіч Дрынеўскі ніколі не падзяляў прафесійнае і аматарскае мастацтва, ён заўсёды іх аб'ядноўваў і ўзбагачаў, падтрымліваў і папулярызаваў, кіруючыся запаветам знакамітага карыфея беларускай песні Рыгора Шырмы, што сапраўдная песня – гэта душа народа.

Разам з асноўнай прафесійнай і выкладчыцкай працай у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Міхась Паўлавіч быў ініцыятарам і арганізатарам шырокай музычна-асветніцкай дзейнасці, вельмі актыўна займаўся і грамадскімі справамі – узначальваў журы фестываляў і конкурсаў, экспертныя камісіі і саветы, быў ініцыятарам стварэння і нязменным кіраўніком грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз музычных дзеячаў», актыўна супрацоўнічаў з Беларускім фондам культуры ў рэалізацыі шматлікіх праектаў, з беларускай дыяспарай за мяжой.

За выдатныя дасягненні ў развіцці музычнага мастацтва, папулярызацыю культурнай спадчыны беларускага народа М. Дрынеўскі быў адзначаны шматлікімі ганаровымі званнямі і ўзнагародамі, сярод якіх акрамя ўжо названых – заслужаны дзеяч мастацтваў, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, медаль і ордэн Францыска Скарыны, ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга і многія іншыя.

У шчырым суладдзі з музыкай і песняй народны маэстра пражыў сваё жыццё. Як зазначыла народная артыстка Беларусі, галоўны хормайстар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Ніна Ламановіч, «сваім сыходам ён замкнуў суцэльную плеяду тых, хто ўзнімаў да сусветных акадэмічных вяршыняў беларускую народную песню, не сапсаваўшы яе сутнасці: Рыгор Шырма, Генадзь Цітовіч, Міхась Дрынеўскі»...

**ГА «Беларускі фонд культуры» і рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» глыбока смуткуюць з нагоды смерці Міхася Паўлавіча Дрынеўскага. Яго імя ўжо навекі ўпісанае залатымі літарамі ў сучасную гісторыю Беларусі.**



15 лістапада на 73-м годзе жыцця памёр дыпламат, пісьменнік, перакладчык і публіцыст **Уладзімір ШЧАСНЫ**. Нарадзіўся і скончыў школу ў Смаргоні. Па сканчэнні Мінскага педінстытута замежных моваў у 1972 г. стажыраваўся ў Пакістане. Скончыў курсы ААН пры Маскоўскім інстытуце замежных моваў імя М. Тарэза (1978). У 1978 – 1982 гг. супрацоўнік службы рускіх пісьмовых перакладаў Сакратарыята ААН у Нью-Ёрку. Потым працаваў на розных пасадах у Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь. З 1993 г. паверaны ў справах Рэспублікі Беларусь у Літве; у 1995 – 2000 гг. – Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Вялікабрытаніі і, па сумяшчальніцтве, у Ірландыі. У 2001 – 2013 гг. – старшыня Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. Мае ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла.

У 2003 г. быў ініцыятарам правядзення ў Залессі (Смаргонскі раён) міжнароднай канферэнцыі «Гістарычныя сядзібы. Стан і перспектывы», а таксама падрыхтоўкі пры садзейнічанні ЮНЕСКА дакументаў на рэстаўрацыю былога маёнтка М.К. Агінскага і атрыманне копіі архіва кампазітара з Дзяржаўнага архіва старажытных актаў у Маскве.

Аўтар артыкулаў па пытаннях культуры, гісторыі выяўленчага мастацтва, кніг «Художники Парижской школы из Беларуси: эссе, биографии, путеводитель», «Париж», «Альбатросы», каталога выстаўкі «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі». У галіне мастацкага перакладу перакладаў з англійскай мовы і ўрду на беларускую.

Аўтар драматычных твораў, што пастаўленыя Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатрам імя Якуба Коласа.

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1998, 2006), медалём Францыска Скарыны (2009).

Актыўна супрацоўнічаў з БФК у рэалізацыі шматлікіх праектаў у галіне гісторыка-культурнай спадчыны.

**Выканкам і Рада ГА «Беларускі фонд культуры» і рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» смуткуюць з прычыны смерці даўняга сябра арганізацыі і газеты. Памяць пра Уладзіміра Рыгоравіча захаваецца ў нашых сэрцах. Выказваем шчырыя спачуванні родным, блізкім і калегам спачылага. Няхай супакоіць яго родная смаргонская зямля.**



На 65-м годзе жыцця ў Пінску памёр кандыдат фізіка-матэматычных навук, выкладчык Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій і інтэлектуальных сістэм ПалесДУ, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі тэхнічнай адукацыі (2005 г.) **Аляксандр ІЛЫН**. А яшчэ – ён захапляўся краязнаўствам і гісторыяй Беларускага Палесся, быў галоўным рэдактарам часопіса «Гістарычная Брама: гісторыя і культура Палесся», друкаваў вынікі даследаванняў у тым ліку ў «Краязнаўчай газеце».

**ГА «Беларускі фонд культуры» і рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» смуткуюць з прычыны смерці выбітнага краязнаўцы Аляксандра Львовіча Ільіна і выказваюць спачуванні яго родным, блізкім і калегам.**

## На тым тыдні...

### *Ратуемся спадчынай*

✓**4 лістапада** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адбылося адкрыццё фотапраекта Станіслава Янчарскага **«Планета без виз»**. Гэта своеасаблівая выстава-падарожжа, дзе экспануюцца прыкладна 170 здымкаў, зробленых аўтарам, ураджэнцам Гродзеншчыны, у 25-і краінах свету, – Беларусі, Аргенціне, Бразіліі, Грэцыі, Італіі, Ісландыі, Нарвегіі, В'етнаме, Камбоджы, Чылі... Большасць здымкаў зробленая ў часе падарожжаў 2014 – 2020 гг., аўтар пабываў у 48-і краінах. Асобны раздзел прысвечаны Мінску, адкуль пачынаецца кожная вандроўка і куды з радасцю вяртаецца дадому. С. Янчарскі аўтар кніг «Зарисовки путешественника», «Нежный холод», выдаў 1-ы том 3-томнага выдання «Костёлы Беларуси».

Выставу можна пабачыць па 6 снежня (а штосуботу – сюрпрыз ад фотавандроўніка – бясплатны ўваход для жанчынаў).

✓ На восеньскіх канікулах навучэнцы СШ № 2 г. Слаўгарада **падарожнічалі па родным горадзе** разам з экскурсаводам раённага гісторыка-краязнаўчага музея Верай Стасенка. Вучні знаёміліся з назвамі вуліцаў, аглядалі архітэктурныя пабудовы розных часоў. Апошняй кропкай на шляху ў падарожнікаў стаў памятны знак «Якар», што ўзвышаецца на беразе р. Сож, да якога імкне і нясе свае воды хвалістая прыгажуня р. Проня. У гэтым маляўнічым месцы дзеці пазнаёміліся з гістарычнымі назвамі горада, суднаходствам, што некалі існавала тут, і нават з прамысловым прадпрыемствам па вырабе керамічнай пліткі, на экзэмплярах якой маюцца знакі майстраў Н. Лур'е і К. Ганчарова.

Пад час падарожжа вучні фатаграфавалі цікавыя мясціны горада, архітэктурныя збудаванні.

✓Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь з **6 лістапада** ў межах праекта НЦСМ «Сям'я» запрашае на выставу **«Рукапісы гарацьь»**, якая нанова адкрывае імя Алены Шыдлоўскай – мастачкі і паэткі, яркай асобы. У 1970-я гг. яна была адлічана з мастацкай вучэльні. Працавала мастаком-афарміцелем, настаўніцай малявання і беларускай мовы ў вясковых школах, экскурсаводам, актыўна ўдзельнічала ў арганізацыі музея ў в. Дукора. Паэткі рана не стала, і яна не выпусціла аніводнага паэтычнага зборніка, засталіся толькі рукапісы, якія і дагэтуль «гараць». Мастацтва і паэзія Алены неразрыўна звязаныя між сабою.

Побач з графікай і жывапісам А. Шыдлоўскай на выставе прадстаўленыя творы яе мужа Ігара Кашкурэвіча і дачкі Агніі Кашкурэвіч.

Творы ў экспазіцыі прадастаўленыя мастакамі, калекцыянерам Андрэем Плясанавым і Беларускім саюзам мастакоў.

Выставу можна ўбачыць у НЦСМ (пр. Незалежнасці, 47) па 6 снежня.

✓У чытальнай зале Жлобінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Н. Крупскай прайшла **прэзентацыя кніг жанчынаў-пісьменніцаў**. Імёны публіцыста і грамадскага дзеяча Святланы Прыходзька і журналіста, паэта, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Людмілы Шакудаевай добра знаёмыя жыхарам раёна. Павіншаваць з новымі кнігамі і сказаць прыязныя словы прыйшлі паэтка Таццяна Мікалаенка, мастак Уладзімір Слесараў ды іншыя землякі.

✓**10 лістапада** (трансляцыя на старонцы Польскага інстытута ў Facebook) у рамках цыкла «Месяц польскай літаратуры – 2020» адбылася прэзентацыя II тома сагі Анджэя Сапкоўскага **«Вядзьмар. Меч наканавання»**. Раман выйшаў пры падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску ў выдавецтве «Янушкевіч», на беларускую мову твор пераклала Кацярына Мацiеўская.

У прэзентацыі бралі ўдзел літаратуразнаўца і даследчык творчасці А. Сапкоўскага Пётр Жоландзь, перакладчыца К. Мацiеўская і рэдактар беларускамоўнай серыі Ганна Янкута.

Удзельнікі сустрэчы, сярод іншага, спрабавалі даць адказы на пытанні пра ролю, што адыгрывае ў творы фальклор, пра паходжанне і аўтарскую інтэрпрэтацыю казачных сюжэтаў. Ці з'яўляецца Вядзьмар добрым героем у часы крызісу? Што адрознівае беларускі пераклад рамана?

*Скарыстаная інфармацыя з паведамленняў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага (Мінск), Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, Польскага інстытута ў Мінску, сайтаў газет «Прысожскі край» (Слаўгарад), «Новы дзень» (Жлобін)*

**Падпіска 2020 → Падпіска 2021**

*1. Я 24 гады на пенсіі. Выпісваю «Краязнаўчую газету» з 2004 г. Думаю выпісаць яе і ў 2021-м.*

*2. Паспрабую сагітаваць Германавіцкую сярэднюю школу, Германавіцкую сельскую бібліятэку, але ў раённага аддзела адукацыі і аддзела культуры мала грошай на падпіску на «Краязнаўчую газету» і іншыя выданні. Падпісныя цэны кожны год растуць, чаго не было ў Савецкім Саюзе. Магчыма, падпішуцца настаўнікі-краязнаўцы Германавіцкай сярэдняй школы.*

*3. Для мяне больш зручны папяровы фармат газеты.*

*4. Прапаноўваць можна многае. Я хацеў бы прачытаць на старонках газеты па гісторыі раённых цэнтраў, былых раённых цэнтраў, такіх, як Дзісна, Відзы, Варапаева, Падсвілле, матэрыялы па гісторыі мястэчак, вялікіх, сярэдніх і маленькіх вёсак.*

*Прапаную рэдакцыі выдаваць брашуры, невялікія кніжачкі па матэрыялах, надрукаваных у «Краязнаўчай газеце».*

*Два гады таму ў «Краязнаўчай газеце» (№ 35, верасень 2018) быў надрукаваны мой артыкул «Кожнаму краязнаўцу – "Краязнаўчую газету"»!», у якім прапанаваў, як удасканаліць змест газеты. Цяпер я высылаю вам артыкул (пісьмо) «Краязнаўчай газеце» – быць!», дзе расказваю аб сваёй краязнаўчай працы ў Браслаўскім і Шаркаўшчынскім раёнах, аб музейнай працы ў Германавіцкім мастацка-этнаграфічным музеі імя Язэпа Драздовіча. Паўтараю свае прапановы па ўдасканаленні зместу газеты.*

*Выпісваю яшчэ з самага пачатку выдання газету Таварыства беларускай мовы «Наша слова», тыраж якой складае 1200 асобнікаў. Калі тыражы абодвух выданняў яшчэ зменшацца, то ў 2021 г. гэтыя беларускамоўныя выданні, напэўна, не будуць выходзіць. У Беларусі па-беларуску яшчэ выдаюцца газеты «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Культура». Усе жыхары Беларусі павінны падтрымаць беларускамоўныя выданні, бо кожны падпісчык – гэта голас у падтрымку краязнаўства і беларускай мовы.*

*Кліменцій КОЖАН,*
*пенсіянер, м. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна*

# Пад знакам дабрыні




***У кастрычніку споўнілася 85 гадоў з дня нараджэння нашага знакамітага земляка Уладзіміра Паўлава.***

***З нагоды гэтай значнай падзеі на Любаншчыне прайшлі разнастайныя мерапрыемствы. Не абмінула нагоду і Рэдкавіцкая сельская бібліятэка. Тут зладзілі літаратурную гасцёўню-падарожжа паводле кнігі Уладзіміра Андрэевіча «Згадка на дабро». Змястоўны і цікавы сцэнарый для сваіх выхаванцаў распрацавалі настаўнікі пачатковых класаў Таццяна Корбут і Святлана Дастанка. А напярэдадні была афармленая кніжная паліца «Уладзіміру Паўлаву – 85!», прайшоў конкурс чытальнікаў «Роднай старонкі – пясняр».***

У незвычайнае «падарожжа» мы выправіліся на чароўным дыване-самалёце, пілотам абралі Таццяну Уладзіміраўну. Яна трапна прызямлялася разам з вучнямі на розных станцыях.

«Знаёмства» стала першым прыпынкам, на якім бібліятэкар падрабязна расказала пра жыццёвы і творчы шлях У. Паўлава.

Нарадзіўся пісьменнік 25 кастрычніка 1935 года ў вёсцы Замошша ў працавітай сялянскай сям'і. Дзяцінства яго было нялёгкім, бо прыйшлося на страшныя дні Вялікай Айчыннай вайны. Бацька Валодзі пайшоў на фронт, а маці з чатырма дзецьмі хавалася ад ворагаў у цеснай сырой зямлянцы. Таму вайна запомнілася хлапчуку свістам варожых куляў, непамерным страхам і лустачкай падсоленага хлеба.

Пасля вайны Валодзя з радасцю пайшоў у школу. Вучыўся старанна, асабліва захапляўся літаратурай. Быў рэдактарам школьнай насценгазеты. Неўзабаве падлетак пачаў пісаць свае вершы, замалёўкі, апавяданні ў раённую газету «Кліч Радзімы», затым у рэспубліканскую газету «Піянер Беларусі». Дарэчы, у апошняй быў змешчаны першы Валодзеў верш «Слаўнае лета».

Пасля заканчэння Дарасінскай сярэдняй школы працаваў у раённай газеце. Служыў у войску (1954 – 1959), потым паступіў на факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Атрымаўшы дыплом (1962), уладкаваўся на працу ў рэдакцыю газеты «Чырвоная змена». З таго часу жыве ў Мінску. У розныя гады працаваў на беларускім радыё, у рэдакцыі кінабюлетэня «На экранах Беларусі», загадчыкам аддзела выдавецтва «Мастацкая літаратура». А ў 1990 годзе наш зямляк быў абраны сакратаром Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Друкуецца Уладзімір Андрэевіч з 1954 года. Выдаў зборнікі паэзіі «Узлётная паласа» (1960), «Далягляд» (1964), «Светацень» (1967), «Начная балада» (1971), «Сонца купаецца» (1976), «Сляза на вейцы» (1982), «Гадавое кальцо» (1986), «Што было на Беларусі» (1994) і іншыя.

З-пад яго пяра выходзяць апавесці і апавяданні «Гады нашы – птушкі» (1970), «Ад агню і мяча» (1973). За аповесці «Анжэліха» (1964) і «Спелыя травы» (1968) наш зямляк стаў лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа.

Скарыстаўшы момант, бібліятэкар паведала дзецям, што ў свае школьныя гады захаплялася прыгодніцкімі аповесцямі «Тайна бункера № 7» (1963) і «Дазор на Сухой Мілі» (1977). Каб іх прачытаць, трэба было загадзя запісацца на чаргу ўвосьу гэтай самай бібліятэцы.

Першая дзіцячая кніга Уладзіміра Андрэевіча «Пажарніца» выйшла ў 1968 годзе і была адзначаная на рэспубліканскім конкурсе на лепшую кніжку для дзяцей, заняла прызавое месца. Затым адна за другой – «Чуж-Чужаніца» (1979), «Радзімкі» (1989), «Колькі гусей убачыў Яўсей» (1994), «Хто знае-адгадае» (1997). У 2004 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выдадзеная «Згадка на дабро», у якую ўвайшлі вершы, забаўлянкі-пазнаванкі, загадкі, паэма-казка.

Таццяна Уладзіміраўна прыспешвае «падарожнікаў», бо наперадзе іх чакае наступная станцыя. І вось яны на «Вершаванай». Тут вылучыліся дзяўчынкі Марыя Кулага, Вольга Серпітоўская і Дар'я Лаўрыненя, якія прадэкламавалі творы пісьменніка. У вершах сустракалася шмат незнаёмых словаў, і Святлана Іванаўна арганізавала працу ў групах. Дзеці тлумачылі значэнне незразумелых словаў з дапамогай слоўніка.




Наступны прыпынак – «Забаўлянкі-пазнаванкі». Вельмі спадабалася «вандроўнікам» забаўлянка-пазнаванка ў выкананні Сафіі Каваленка і Паліны Цыцэня «Кнігі». У такім узросце дзеці любяць чытаць і ім цікава было даведацца, адкуль прыйшлі да нас кнігі, пра нашых першых друкароў – Францыска Скарыну, Івана Фёдарава, Пятра Мсціслаўца, Сымона Буднага, пра тое, што ў друкарні Мамонічаў напрыканцы XVI стагоддзя ў Вільні выпусцілі адзін з першых беларускіх буквароў. На гэтай станцыі вылучылася таксама Ганна Кудзелка, якая выразна прачытала забаўлянку-пазнаванку «Агарод» з поўным кошыкам гароднiны. Сёлета восень парадавала людзей – было што пакласці ў кошык.

Тым часам гарэзлівыя хлапчукі і дзяўчынкі вандравалі далей і наблізіліся да станцыі «Загадкавая», дзе праявілі сваю кемлівасць Крысціна Сабалеўская, Аляксей Зубар, Іван Міхаленя. Дзеці наперабой выкрыквалі загадкі, і іх энтузіязму мог пазайздросціць нават дарослы.

Наперадзе ўжо чакала вучняў станцыя «Для цікаўных», на якой Таццяна Уладзіміраўна засяродзіла ўвагу на тым, што У. Паўлаў актыўна займаўся літаратурнымі перакладамі рускіх, украінскіх, літоўскіх, балгарскіх твораў. Таму імя нашага славутага земляка занесенае ў кнігу гонару «Рупліўцы твае, Беларусь».

На апошняй станцыі «Выніковая» Святлана Іванаўна запрасіла дзяцей адказаць на пытанні «чароўнага мікрафона». Па правільных адказах было зразумела, што вучні з задавальненнем прачыталі кнігу «Згадка на дабро» і былі ўважлівымі пад час гэтага незвычайнага мерапрыемства.

Адметна тое, што Уладзімір Андрэевіч знайшоў сваю сцяжынку да дзіцячых сэрцаў, зразумеў іх душу і адчуў іх патрэбу ў чымсьці незвычайным, казачным, сонечным, таму вясковыя хлапчукі і дзяўчынкі змаглі ўявіць сябе ў вобразах герояў з кніжкі, адкрыўшы для сябе па-іншаму той свет, у якім жывуць і вучацца.

Нібыта нітку за ніткай сплялі юныя чытачы радкі паэтычных твораў нашага слыннага земляка ў прыгожы казачны ўзор, у якім адлюстраваўся непаўторны чароўны свет маленства і дабрыні.

***Марыя СЛІВЕЦ,***
***бібліятэкар***
***Рэдкавіцкай сельскай бібліятэкі,***
***Любанскі раён***

# Пешыя вандроўкі як шлях да выратавання

*Даклад Віктара Сцяпанава*

Напачатку варта пералічыць тыя праблемы, вырашэнню якіх, як мне падаецца, можа паспрыяць развіццё пешага турызму ў нашай краіне.

Першым варта згадаць крызіс у падтрыманні належнага стану здароўя насельніцтва, выкліканы распаўсюдам электронных гаджэтаў, гіпадынаміяй, і, як наступства, пашырэннем сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Другі крызіс назіраецца ў арганізацыі адпачынку, і звязаны ён з матэрыяльнымі праблемамі ў вялікай часткі беларускага насельніцтва, асабліва ў рэгіёнах. Пешыя краязнаўчыя вандроўкі могуць стварыць альтэрнатыву выязному турызму, і нават, прынамсі, у некаторых аспектах, санаторнаму лячэнню, а таксама даюць шанец забеспячэння адпачынку таннага і актыўнага.

Трэці крызіс тычыцца стану мясцовага краязнаўства, у якім пачала адчувацца адсутнасць пераемнасці паміж пакаленнямі. Прыток маладых людзей у шэрагі краязнаўцаў амаль спыніўся, а тыя, хто далучаецца цяпер, выяўляюцца неабазнанымі адносна ўжо зробленага сваімі папярэднікамі (нават жывымі і актыўнымі).

Таму праект мусіць дапамагчы ў колькасным і якасным развіцці краязнаўства, мусіць мець вынікам пераадоленне бар'ера паміж пакаленнямі ў краязнаўстве, прыцягненне маладых людзей да краязнаўства, унясенне ў краязнаўчую дзейнасць новых тэхналогіяўназапашвання, адлюстравання і распаўсюду інфармацыі.



Фота сайта Vpohode.by

### Мэты і задачы

Натуральнай мэтай пешых вандровак ёсць развіццё цікавасці да роднай прыроды, культуры і гісторыі. Трэба спалучыць турызм як спорт з краязнаўствам, тэарэтычным і практычным, гэта значыць у часе вандровак арганізаваць чытанне лекцыяў, на месцы вывучаць гістарычныя і прыродныя помнікі ды добраўпарадкоўваць іх.

Вандроўкі ствараюць спрыяльныя ўмовы для вывучэння прыродных багацця́ў роднага краю, дазваляюць атрымаць уяўленне пра магчымае іх выкарыстанне ў мэтах развіцця мясцовай эканомікі.

Вандроўкі могуць спрыяць экалагічнаму выхаванню, як дзяцей і падлеткаў, так і дарослых, праз практыку прыборкі месцаў грамадскага адпачынку ў наваколлі прыродных аб'ектаў і актыўнай агітацыі за культурныя паводзіны на прыродзе.

Вандроўкі могуць паслужыць справе дэманстрацыі магчымасцяў актыўнага адпачынку і раскрыццю турыстычнага патэнцыялу мясцовых прыродных, архітэктурных, культурных ды гістарычных цікавостак.

Варта спадзявацца, што развіццё мясцовага турызму надасць болей матывавансці барацьбе за захаванне помнікаў гісторыі і культуры, стварэнню і развіццю мясцовых музеяў, барацьбе супраць разрабавання археалагічных помнікаў.

Практычны ўдзел у захаванні прыродных і культурна-гістарычных каштоўнасцяў можа ўключаць добраўпарадкаванне тэрыторыі помнікаў, стварэнне аб'ектаў (напрыклад, пірамідак з камення), усталяванне інфармацыйных шыльдаў. Таксама магло б ажыццяўляцца стварэнне першаснай інфраструктуры (месцаў для вогнішчаў, намётаў, лавачкі, столікі, альтанкі), добраўпарадкаванне крыніцаў.

Вандроўкі, звязаныя з наведваннем культавых пабудоваў, будуць спрыяць выхаванню канфесійнай талерантнасці.

Урэшце, пешыя вандроўкі могуць дапамагчы стварэнню магчымасцяў для аваладання беларускай моваю у сітуацыі актыўных і нефармальных зносінаў, спрыяць літаратурнай творчасці на роднай мове.



Фота сайта Vpohode.by

# Арлоў — летапісец Пухавіччыны

*Даклад Барыса Мухі*

*Краязнавец – галоўны пастаўшчык двара яе Вялікасці Гісторыі*

Лічу, што я стаў краязнаўцам дзякуючы дзвюм Асобам у маім жыцці. Гэта Мікалай Рыгоравіч Гнеўка, выкладчык вышэйшай школы. Ён дапамог мне праз свае заняткі на ўроках і ў гуртку палюбіць гісторыю Беларусі. І вынік гэтай працы – напісанне курсавых работ і дыплома.

Другая асоба – Віктар Рыгоравіч Арлоў, з якім я пазнаёміўся ў студэнцкія гады, калі пачаў цікавіцца мясцовай гісторыяй. Так, працуючы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (былой Ленінцы) па ваеннай тэматыцы, я натрапіў на артыкул «Сорак герояў – сорак подзвігаў». У ім аўтар паспрабаваў сабраць матэрыялы аб лётчыках, якія паўтарылі подзвіг Мікалая Гастэлы. Чытаю – Уладзімір Аляксандравіч Шыманскі. Месца нараджэння – Пухавічы, Гомельская вобласць. «Факт цікавы, пачынай разбірацца, шукай», – параіў Арлоў (я тады яшчэ не ведаў, што ў Гомельскай вобласці таксама ёсць паселішча Пухавічы). У Рудзенску знайшоў жонку героя, якая паказала мне шмат рэчаў свайго мужа, перададзеных яго таварышамі. А ў в. Варонічы пазнаёміўся са старэйшым братам Уладзіміра. Так 27 лістапада 1980 г. у мясцовай газеце «Сцяг працы» (цяпер «Пухавіцкія навіны») з'явіўся артыкул пад назвай «Ён паўтарыў подзвіг Гастэлы».

У нашым раёне імя заслужанага настаўніка Беларусі В. Арлова шырока вядомае. Адны ў яго вучыліся, другія былі на экскурсіях у створаных ім школьных музеях, слухалі яго лекцыі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, выступленні на настаўніцкіх канферэнцыях і метадычных секцыях, чыталі ў раённай газеце яго артыкулы па гісторыі Пухавіччыны, сустракаліся з ім на сходах ветэранаў вайны і працы. І заўсёды ён гаварыў і пісаў аб неабходнасці глыбокага вывучэння гісторыі краю.

Пасля педвучылішча васямнаццацігадовым юнаком прыйшоў В. Арлоў выкладаць гісторыю ў адну з вясковых школ Падмаскоўя. Было гэта ў 1940 г. Не буду расказваць у гэтым артыкуле пра ваенны лёс Віктара Рыгоравіча – гэта асобная тэма.

В. Арлоў паспяхова спалучаў педагагічную дзейнасць з даследаваннем школьных праблемаў, асаблівую ўвагу ўдзяляў гістарычнай адукацыі. З дакладамі з вопыту работы ён выступаў на Усесаюзных канферэнцыях, быў дэлегатам двух з'ездаў настаўнікаў Беларусі, яму першаму ў раёне прысвоенае званне настаўніка-метадыста. Віктар Рыгоравіч удастоены звання заслужанага настаўніка Беларусі, ён узнагароджаны рэдкай педагагічнай узнагародай – медалём Н.К. Крупскай.

Ён шмат зрабіў і па ўвекавечванні памяці герояў апошняй вайны. Менавіта па яго прапанове ў Мар'інай Горцы былі пастаўленыя помнікі савецкім воінам, партызанам і падпольшчыкам, партызанцы Любе Гайдучок, а таксама мемарыяльны комплекс у гонар подзвігу артылерыстаў 48-й арміі ў в. Вузляны. Па яго ж прапанове Мар'інагорскі гарадскі Савет прысвоіў званне ганаровых грамадзянаў горада ўдзельнікам вызвалення краю ў 1944 г., Героям Савецкага Саюза генералам Міхаілу Фёдаравічу Панову, Івану Рыгоравічу Кабякову, палкоўніку Антону Канстанцінавічу Леанцюку, а таксама нашаму земляку – кампазітару Ігару Міхайлавічу Лучанку.

Адзначаны заслугі Віктара Рыгоравіча і ў кнізе У. Малішэўскага і П. Пабокі «Нашы гарады». Вось што яны пішуць у нарысе, прысвечаным Мар'інай Горцы: «На Кастрычніцкай (назва вуліцы) жывуць і многія вядомыя людзі горада, сярод іх Віктар Рыгоравіч Арлоў. Заслужаны настаўнік рэспублікі, краязнавец, удзельнік Сталінградскай бітвы і вызвалення Мар'інай Горкі, ён многае зрабіў і робіць у справе патрыятычнага выхавання моладзі. У сярэдняй школе № 1 (памылка, СШ № 3), дзе працуе ўжо трэці дзясятак гадоў настаўнікам гісторыі, ім арганізаваны 2 музеі: "У.І. Ленін" (так у тэксце) і "Героі і подзвігі", у рабоце якіх прымаюць удзел практычна ўсе вучні, а наведваюць музеі нават госці з-за мяжы. Звыш 50 выпускнікоў школы сталі за гэтыя гады афіцэрамі Савецкай Арміі, амаль столькі ж – выкладчыкамі гісторыі, супрацоўнікамі музеяў. А колькі невядомых раней фактаў і падзей упісалі юныя краязнаўцы ў гісторыю горада, колькі адкрылі новых імён герояў мінулай вайны! За гэту работу Віктар Рыгоравіч узнагароджаны медалём імя Крупскай (у БССР гэтай узнагароды ўдастоеныя менш дзясятка чалавек), многімі дыпломамі і граматамі ўзнагароджаны абодва музеі».




А вось што В. Арлоў піша ў артыкуле «Юность моего города»: «Активизировали свою работу четыре школьных музея: истории Великой Отечественной войны, комсомола Белоруссии,

# шэрага праблем сучаснага грамадства

**Працягласць, удзельнікі ды змест**

Вандроўкі могуць быць як аднадзённыя ці двухдзённыя (так званыя «вандроўкі выхаднога дня»), так і больш працяглыя, прымеркаваныя да датаў і падзей.

Удзельнікамі могуць быць жыхары горада розных узроставых катэгорыяў, з адпаведнымі працягласцю і зместам экскурсіяў паводле ўзросту, адукацыі і асноўных заняткаў.

Пад час вандровак можна было б вывучаць не толькі гісторыю, але і флору з фаўнай, вучыць выжыванню, медыцынскай дапамозе, арыентаванню. Напрыклад, удзельнікі з ліку дарослых могуць у працэсе вандроўкі атрымліваць тэарэтычныя веды пра выжыванне ў прыродзе і першапачатковую медыцынскую дапамогу. Потым гэтыя веды маглі б замацоўвацца пад час практычных заняткаў.

Таксама можа выкладацца інфармацыя пра лекавыя ўласцівасці мясцовых раслінаў, а таксама спосабы арыентавання ў лесе.

Заўважу, што вельмі прыкра чытаць кожнае лета і восень трагічныя гісторыі гібелі нашых суайчыннікаў у лесе пад час паходаў у грыбы ці ягады, з улікам таго, што беларусы – лясны народ, і мусілі б лёгка знаходзіць у лесе ўсё неабходнае для выжывання. Прычым гэта можа быць як асноўным зместам вандроўкі, так і дадаткам да асноўнай інфармацыі пра гістарычныя альбо геаграфічныя аб'екты.

Завяршацца вандроўкі маглі б добраўпарадкаваннем гістарычных аб'ектаў, усталяваннем на месцы інфармацыйных стэндаў, вызначэннем каардынатаў для пазначэння на адмысловай электроннай мапе.

Па выніках вандровак можна праводзіць выставы альбо здымаць фільмы. Адзначу тут вельмі карысную ініцыятыву арганізатараў конкурсу аматарскага турыстычнага кіно «Путешествуем по Синеокой».




Адной з праблемаў і неабходных умоваў развіцця мясцовага турызму з'яўляецца забеспячэнне неабходнага ўзроўню камфорту, асабліва ў выпадку сямейнага адпачынку. Гэтага можна, на маю думку, дасягнуць праз уключэнне ў маршруты аб'ектаў аграturyзму.

**Вынікі**

Развіццю пешых вандровак можна спрыяць праз адмысловы інтэрнэт-рэсурс, на які можна было б выкладаць гатовыя маршруты, з магчымымі варыяцыямі, з каардынатамі GPS ды з аўдыяфайламі, тэкстам, фотаздымкамі, відэа. Варта было б забяспечыць магчымасць карыстальнікам дадаваць свае матэрыялы.

Усялякага пашырэння заслугоўвае і такі сучасны сродак інфармавання, як QR-код, які мог бы размяшчацца па шляху вандроўнікаў і такім чынам служыў бы падвышэнню бяспекі вандровак.

Па выніках вандровак распрацаваныя і выпрабаваныя маршруты мусілі б стаць здабыткам грамадскасці праз некалькі варыянтаў арыентавання на мясцовасці, як традыцыйных, так і сучасных:

* з дапамогай праваднікоў;

* з выкарыстаннем традыцыйнай папяровай мапы;

* з выкарыстаннем GPS-навігацыі;

* з выкарыстаннем размешчаных у ключавых пунктах маршрутаў білбордаў з комплексам інфармацыі: выявай мапы з пазначэннем месца размяшчэння білборда; каардынатамі паводле GPS; QR-кодам; тэлефонамі для выкліку праваднікоў і спецыяльных службаў (выратавальнікаў, міліцыі).

Болей інфармацыі можна знайсці на форуме сайта «Глобус Беларуси», у раздзеле «Вопросы о путешествиях».




*Праект эмблемы турысцкага клубу для Віцебска і Оршы*

партизанского движения и, самый большой среди них, старейший в Белоруссии – музей В.И. Ленина. Недавно открылся музей истории техникума, которому в 1966 году исполнилось девяносто лет.

Любопытное письмо прислал в этот музей воспитанник техникума Николай Никифорович Корженевский: “Осенью 1920 года с сумкой за плечами, с ботинками в руках я пошёл пешком в училище (так назывался тогда техникум). Около деревни Синча встретился с красноармейской тачанкой и спросил у бойцов дорогу. Когда рассказал, что иду в училище со Слутчины, за сотню километров, комиссар сказал бойцам: “Смотрите, Ломоносов”... Комиссар не ошибся. Н.Н. Корженевский стал учёным. “Ломоносовыми” стали и другие питомцы техникума: доктор сельскохозяйственных наук И.Д. Юркевич, А.И. Новик, Р.Н. Вильдфлуш, член-корреспондент Академии наук БССР И.М. Качура...».

У 1973 г. у мясцовай газеце з'яўляецца артыкул В. Арлова «Вывучаючы гісторыю роднага краю». Што клапоціць Віктара Рыгоравіча? «Даўно прыйшоў да перакanання, што вывучэнне гісторыі роднага краю ў школе мае вялікае значэнне… На жаль, у некаторай часткі педагогаў, асабліва маладых, сустракаюцца і негатыўныя, іранічныя адносіны да гісторыі родных мясцін. Можна пачуць разважанні: “Ды якая там у нас гісторыя”, “Сяло наша нічым не славутае”. Як жа яны не правы! Я перакананы: мінулы, як і сённяшні дзень кожнай вёскі і раёна, багаты многімі падзеямі».

Якім быць школьнаму музею? Гэтыя пытанні заўсёды хвалявалі настаўніка Арлова.

«Как-то мы провели среди старшеклассников анкету “Я и музей”. Вот что написала комсомолка-десятиклассница Тамара Хромова, отвечая на эту анкету: “В эту школу я пришла недавно, но сразу меня поразило, какое место в жизни школьного комсомола занимает музей. Я тоже была включена в его работу. В той школе, где я раньше училась, тоже был музей Ленина, но он был как будто не наш, за нас всё делали учителя. А здесь музей целиком “ребячий”».

«Нярэдка бывае так: запрасілі ў школу цікавага чалавека, пагутарылі з ім і на тым справу палічылі закончанай. На наш погляд, сустрэча з цікавымі людзьмі павінна быць пачаткам вялікай выхаваўчай размовы з юнымі. У нас такая праца працягваецца. Так, праз некалькі дзён на класнай гадзіне мы зноў вярнуліся да выдатнай падзеі і правялі гутарку “Што я пачуў, убачыў і даведаўся на сустрэчы з партызанскім палкаводцам”. Адбыўся цікавы абмен думкамі. Цяпер вучні рыхтуюць фотаальбом “Сустрэча з начальнікам Цэнтра штаба партызанскага руху”. Мы працягваем перапіску з П.К. Панамарэнкам, перапіску, якая ўзбагачае школьнікаў новымі ведамі», – піша Арлоў у «Настаўніцкай газеце».

«...У кожнага школьніка абавязкова ёсць адзін самы любімы настаўнік. Ёсць такі і ў мяне. Гэта выкладчык гісторыі Віктар Рыгоравіч Арлоў», – піша вучаніца 10 класа, слухач школы рабкораў Э. Драбышэўская. І працягвае: «Віктару Рыгоравічу мы абавязаны не толькі сваімі ведамі па гісторыі, але і тым, што вучымся ў школе, дзе створаны адзін з лепшых першых школьных музеяў – музей У.І. Леніна. Дзеці нават жартуюць з гэтага выпадку: “Нельга ўявіць Віктара Рыгоравіча без музея, а яшчэ цяжэй уявіць музей без Віктара Рыгоравіча”... З Віктарам Рыгоравічам можна гутарыць на любую тэму, таму што, па-мойму, няма нічога, чым бы ён не цікавіўся. Такой бадзёрасці, такому юнаму сэрцу, маладому запалу ва ўсіх камсамольскіх справах можа пазайздросціць кожны з нас. Мы вельмі ганарымся сваім настаўнікам, якога ведае ўвесь раён».

У размове з Алесем Карлюкевічам я сказаў, што трэба выпраўляць памылку, якая існуе доўгі час. Бо В. Арлоў з'яўляецца стваральнікам не двух, а трох музеяў у горадзе. І гэтаму ёсць дакументальнае пацвярджэнне. У сумесных артыкулах «Чалавек жыве, пакуль яго помняць» і «Стваральнік трох музеяў» А. Карлюкевіч разам са мной выказвае думку аб тым, «што зараз філіял раённага краязнаўчага музея СШ № 3 мог бы насіць імя Віктара Рыгоравіча Арлова» і «вельмі важна (і гэта думка гучыць не ўпершыню) аб'яднаць намаганні ды выдаць хаця б невялікую гісторыка-краязнаўчую кніжку В. Арлова. А матэрыялу дастаткова. Ён толькі да свайго пяцідзесяцігоддзя (1972 г.) прачытаў каля 500 лекцыяў і дакладаў. А супрацоўнікі раённай бібліятэкі падлічылі, што толькі ў мясцовай газеце В. Арлоў надрукаваў больш за 800 артыкулаў».

У «Пухавіцкіх навінах» за 31 ліпеня 1993 г. змешчаны некралог і два апошнія артыкулы Віктара Рыгоравіча. Пайшоў з жыцця воін, які вызваляў Пухавіччыну ў 1944-м, настаўнік, які перадаваў свае веды нашым дзецям, грамадзянін, які шчыра любіў наш раён і шмат зрабіў, каб яго палюбілі ўсе жыхары Пухавіцкага краю...

На маім пісьмовым стале ляжыць газета «Савецкі настаўнік», вельмі дарагая для мяне. У артыкуле «Любіць свой край» чытаю: «Чалавекам, які горача любіць гісторыю роднага краю, жадае больш глыбока вывучыць яго мінулае і сённяшні дзень, ведаю я пяцікурсніка гістарычнага факультэта Барыса Муху. Упэўнены, што праз некаторы час у школу прыйдзе цудоўны настаўнік гісторыі, які прынясе ёй сваю любоў да роднага краю, да яго гісторыі, да яго людзей». Аўтар – В. Арлоў, настаўнік-метадыст Мар'інагорскай сярэдняй школы № 3 Пухавіцкага раёна, заслужаны настаўнік БССР. Дзякую Вам за гэта, Віктар Рыгоравіч!

Мы, нашчадкі славутага настаўніка, павінны аддаць даніну памяці. На маю думку, Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі дасць штуршок для таго, каб правесці раённую краязнаўчую канферэнцыю, прысвечаную стагоддзю з дня нараджэння В. Арлова.

---

Друкуецца са скарачэннямі.

№ 42 – 43 (815 – 816), лістапад 2020 года




# Імгненні гісторы малой радзімы

***Свіслаччына – самабытны і маляўнічы край з багатай гісторыяй і культурнымі традыцыямі. Здабываючы кожны дзень нешта новае для сябе, чалавек павінен захаваць тое святое, спрадвечнае, што продкі называлі непарыўнай повяззю часоў, – нашую спадчыну.***

***Да Года малой радзімы Свіслацкая раённая бібліятэка склала фоталетапіс «Быт нашых продкаў». Мэта яго – нагадаць сучаснікам пра гісторыю Свіслаччыны, яе вытокі і элементы паўсядзённага і святочнага жыцця, паказаць, як жылі, працавалі і адпачывалі дзяды-прадзеды, расказаць пра рамёствы і народныя промыслы, традыцыі, звычаі і абрады жыхароў краю.***

Раздзел фоталетапісу «Паўсядзённае жыццё нашых продкаў» паказвае штодзённую працу людзей розных прафесіяў, прылады працы і новую тэхніку – першага памочніка селяніна. У фотаздымках адлюстраваны знешні выгляд продкаў: сезонная, будзённая і святочная вопратка. Можна разгледзець асаблівасці знешняга выгляду вясковых і гарадскіх жыхароў. Прадстаўленыя фота 1950-х гадоў, калі традыцыйным было рабіць фотаздымкі каля этажэркі, трымаючыся за яе рукой, і на фоне саматканых дываноў.




Частка фотаздымкаў прысвечаная заняткам свіслачанаў у вольную хвіліну.

Свет дзяцінства продкаў, якое было розным – вясёлым, сумным або трывожным – раскрываюць фотаздымкі раздзела «Дзіцячыя і школьныя гады». Прапануюцца фотаматэрыялы вучняў вядомай Свіслацкай гімназіі, першага пасляваеннага выпуску Свіслацкай школы, а таксама школьныя фота розных гадоў вучняў школ раёна.

З самабытнымі рамёствамі Свіслаччыны знаёмяць фотаздымкі раздзела «Рамёствы і народныя промыслы». На фота прадстаўленыя поразаўскія ганчары і іх вырабы чорназадымленай керамікі, што былі вядомыя не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі; ткачыхі і бондары, умельцы па вязанні і шыцці, вышыванні і пляценні паясоў. Фотаздымкі адлюстроўваюць, як нашыя продкі пралі на калаўроце, выраблялі пляцень, укладаючы ў справу талент, вопыт і мастацкі густ.




У раздзеле «Традыцыі, звычаі, абрады» змешчаныя фотаздымкі вясельнага абраду – аднаго з самых старажытных абрадаў на Свіслаччыне: фота адроджанага Навадворскага і Свіслацкага вяселляў паводле запісаў фалькларыста Міхаіла Федароўскага; калектыўныя вясельныя фотаздымкі розных часоў; убранне маладых; сімвал пачатку новага сямейнага жыцця – ручнік пад ногі маладым; першы танец для маладых і ўскладванне кветак да помніка загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны. За шмат гадоў многія старажытныя элементы вясельнага абраду страчаныя, але галоўныя моманты засталіся і захаваліся да нашых дзён. Аб тым, як услаўлялася беларуская народная песня, самабытны беларускі фальклор, бачна з фота калектываў мастацкай самадзейнасці Свіслаччыны – удзельнікаў раённых, абласных і рэспубліканскіх мерапрыемстваў. Выклікаюць цікавасць фотаздымкі провадаў у армію, правядзення ў Поразаве гульні «Зарніца», першамайскіх дэманстрацыяў.




Усе прадстаўленыя фотаздымкі маюць сваю гісторыю, якую беражліва захоўвае кожная сям'я.

*Аксана ЦІТОК,*
*бібліятэкар аддзела*
*бібліятэчнага маркетынгу*
*Свіслацкай раённай бібліятэкі*

# У краі, дзе ўсе — радня



На высокім беразе Дняпра раскінуліся паркі і скверы, пасталі дамы, а лугавы водар так і вабіць на прыгожую набярэжную. Гэта – горад нафтавікоў, Рэчыца. Горад, дзе я нарадзіўся і рос. Нядаўна сюды я завітаў са здымачнай групай. Сябры прапанавалі да майго 80-годдзя зняць тэлефільм, прайсціся сцежкамі майго даўняга маленства і юнацтва, сустрэцца з роднымі і блізкімі людзьмі. У гэтым горадзе прайшло маё паваеннае маленства, тут пачатак працоўнай дзейнасці на фанерна-мэблевым камбінаце, тут першыя, кволыя, крокі ў мастацтва, першы мастацкі кіраўнік Эдуард Сцяпанчанка.

Завіталі таксама ў вёску Гарывада, дзе калісь жыла мая бабуля, дзе падрастаў і я. У адным з вершаў я напісаў такія радкі:

*Гарывада, Гарывада,*
*Уся вёсачка – радня.*
*Вада не загарэлася,*
*А нафта тут пайшла.*

Бабулінай хаты, дзе малым гуляў у пяску, даўно няма, застаўся толькі ўспамін… А сустрэла нас тут Зінаіда Цімашэнка (дачка майго хроснага бацькі) з мужам Генадзем. Захаваліся на відэа цёплая сустрэча і вячэра ў кветкавым двары. Як хораша амаль у восемдзесят адчуць цеплыню вясковай вуліцы, зямелькі, якая вырасціла й выгадавала! Яшчэ з аднога майго верша:

*Зямля – Радзіма – Рэчыца.*
*Тут усе мне – сваякі.*
*Сюды я еду з радасцю,*
*Край, сэрцу дарагі.*

Былі таксама выдатныя радасныя сустрэчы з роднымі – пабачыў Котавых, Лаханькоў… Завіталі на магілу дарагой матулі Праскоўі Якаўлеўны. Як хораша дыхаецца ў родным краі, як шапочуць кветкі, як перагукваюцца птушкі! І толькі – успаміны, успаміны…

…Складаюць апаратуру Сяргей Яноўскі, Аляксандр Гаварко, Васіль Кулікоў. А я шчаслівы і ўдзячны за сустрэчу з маленствам, з роднымі людзьмі, даўно знаёмымі краявідамі майго Рэчыцкага краю. Развітваюся з усімі, нізка кланяюся. Сцеражы вас Бог, да новых сустрэчаў!

*Мікола КОТАЎ,*
*фалькларыст, харэограф,*
*г. Мінск*
*Фота Васіля Кулікова*



*Царкоўнае краязнаўства*

# Храм, які пабыў музеем

Цяпер Морына – аграгарадок у Іўеўскім раёне. Уваходзіць у склад Іўеўскага сельсавета, а да 2017-га само было цэнтрам Морынскага сельсавета. Знаходзіцца за 10 км на паўднёвы захад ад райцэнтра, за 148 км ад Гродна, за 19 км ад чыгуначнай станцыі Гаўя. Каля вёскі працякае рака Нёман.

У мінулым вёска Морына мела назву Морын. Назва набыла сучаснае гучанне толькі ў пасляваенны час. Дакументальна пацверджаных звестак гісторыі ранейшай і цяперашняй назвы вёскі аўтару гэтых радкоў знайсці не ўдалося.


Помнік Роху Брахоцкаму

У XVII стагоддзі Морын уваходзіў у Ашмянскі павет Віленскага ваяводства. У 1739-м стаў уласнасцю навагрудскага кашталяна Навасельскага, які атрымаў ад канцлера ВКЛ гэтае паселішча разам з мястэчкам Уселюб і навакольнымі вёскамі. З 1680 года мястэчка Уселюб – цэнтр уніяцкай парафіі. Тут дзейнічала драўляная царква, пабудаваная з дапамогай гетмана ВКЛ Януша Радзівіла. Царква Нараджэння Багародзіцы ў сяле Морын была прыпісаная да Уселюбскага храма. Вельмі даўно (паводле ўспамінаў старажылаў вёскі 70-80 гадоў мінулага стагоддзя) каля магілы былога ўладальніка Роха Брахоцкага стаялі старая і невялікая царква, а побач былі сельскія могілкі. Яны займалі тэрыторыю, дзе цяпер размешчаны сельскі клуб.

Рох Брахоцкі быў пахаваны каля ўніяцкай царквы ў 1836 годзе. Яго жонка Аляксандра Алендская пахаваная на Ішчолнскіх могілках непадалёк капліцы ў Шчучынскім раёне.

Брахоцкія па веравызнанню былі каталікамі, як і ўся тагачасная беларуская шляхта. Р. Брахоцкі быў пахаваны тут у час, калі праваслаўная і каталіцкая царква былі аб'яднаныя Брэсцкай царкоўнай уніяй 1596 года. Пасля канчатковага ўваходу беларускіх земель у склад Расійскай імперыі ўніяцкая царква была паступова ліквідаваная, а праваслаўныя храмы перайшлі ў падначаленне Маскоўскай патрыярхіі.

Як сказана вышэй, памяшканне ўніяцкай царквы было маленькім і старым. Таму ўзнікла неабходнасць у новым храме. І ў 1865 годзе побач з помнікам Р. Брахоцкаму была ўзведзеная новая драўляная царква, асвечаная ў гонар Святой Тройцы. У той час вёска Морын адносілася да Уселюбскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні.

Паводле сведчанняў старажылаў, Свята-Траецкая царква была пабудаваная ў 1865 годзе за грошы царскага ўрада. Яе будынак быў драўляны, на каменнай падмуроўцы, складзены васьмівугольнікам з адным вялікім купалам і званіцай на франтоннай частцы. Страха ґонтавая. Пры храме дзейнічалі царкоўна-прыходскае папячыцельства і школа.

Быў аформлены новы іканастас, які пафарбавалі ў белы колер, меў пазалочаныя карнізы і рамы. Складаўся з 8-і іконаў, размешчаных у адзін шэраг. У царкве таксама была старажытная маляваная ікона Божай Маці, напісаная на палатне, памерам 1 на 1/4 аршына, пакрытая нізкапробнай срэбнаю рызай.

Неабходныя для богаслужэння царкоўныя рэчы меліся ў дастатковай колькасці, у тым ліку срэбная даразахавальніца і набор літургійных пасудзінаў, ахвяраваных у 1860 годзе імператрыцай Марыяй Аляксандраўнай.

Званіца мела тры званы рознай вагі.

У прыход уваходзілі 11 вёсак (1056 мужчын і 1123 жанчыны). Першым настаяцелем быў Арэн Іўвенцін. Пра наступнага святара Івана Здановіча сведчыць помнік, што захаваўся на тэрыторыі храма. Лёс прызначыў яму кароткі адрэзак жыцця – усяго 34 гады. Помнік над яго магілай узведзены ў жніўні 1878 года бацькамі, братамі і сёстрамі; на ім высечаныя словы: «Чаю воскресения мёртвых и жизнь будущего века!».

Звесткі пра наступных святароў царквы не маюць дэталёвых падрабязнасцяў. Старажылы вёскі згадалі айца Субача, імя якога яны не запомнілі. Пасля тут працаваў Павел Дзяшкоўскі, які карыстаўся вялікім аўтарытэтам у прыхаджанаў. Аднак ў Першую сусветную вайну паехаў на сваю радзіму ў Рэчыцу і не вярнуўся.

Вёска ў 1915 годзе была акупаваная германскімі войскамі. Салдаты для свайго пражывання занялі дом святара і гаспадарчыя пабудовы. Аднак яшчэ да прыходу немцаў мясцовыя жыхары схавалі царкоўныя званы ў зямлі. Царква ў гады вайны была зачыненая на замок. Вернікі хадзілі пешшу і ездзілі маліцца ва Уселюб.

У 1917 годзе служыць у царкве прыехаў Іван Ржэцкі, былы машыніст-чыгуначнік з Мінска. Яго жонку звалі Аляксандра Міхайлаўна. Дом, у які пасялілася сям'я Ржэцкіх, быў узведзены ў 1904 годзе.

У іх сям'і нарадзілася 8 дзяцей: Лідзія, Віктар, Валянціна, Людміла, Сяргей, Яўген, Георгій, Вольга. Старэйшая дачка Лідзія нарадзілася ў 1899 годзе ў Мінску. У 17-гадовым узросце яна захапілася тэатральным мастацтвам. З 1921 года Лідзія – на прафесійнай сцэне, а праз некаторы час – вядучая актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Яе творчая праца была адзначаная званнямі і ўзнагародамі: народная артыстка СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

У 1952 годзе І. Ржэцкі з жонкай яшчэ жылі ў вёсцы Морына, але потым іх узяла да сябе дачка Вольга, якая жыла ў вёсцы Трабы нашага раёна. Там яна служыла ў царкве псаломшчыкам, а яе муж Анатоль Лявіцкі – дзякам. І. Ржэцкі памёр у 1953 годзе, а яго жонка – у 1957-м. Яны пахаваныя каля царквы Пятра і Паўла ў вёсцы Трабы (пра гэтую сям'ю я ўжо пісаў падрабязней у «КГ» ).

Протаіерэй І. Ржэцкі пакінуў службу па старасці ва ўзросце 76-і гадоў. Яго месца заняў сын Георгій. Ён закончыў Навагрудскую гімназію і прыкладна 15 гадоў працаваў настаўнікам пачатковых класаў у вёсцы Дзятлавічы Ваўкавыскага раёна. Пасля вайны Георгій закончыў Жыровіцкую духоўную семінарыю, атрымаў сан. Спачатку служыў у царкве вёскі Дзятлавічы. Потым з жонкай і 6-ю дзецьмі пераехаў у Морына і замяніў на службе бацьку.

Аднак служыў Георгій нядоўга – прыкладна тры гады. Прычынай стала трагедыя, што здарылася з сынам, якога таксама звалі Георгіем. У 1952 годзе ён закончыў 7 класаў мясцовай школы. Увечары 15 лютага 1953 года яго забілі два нецвярозыя мясцовыя бандыты (хлопцамі іх не хочацца называць) каля варот дома бацькоў. Прычынай забойства стала рэўнасць з-за мясцовай дзяўчыны.

Георгій быў пахаваны каля царквы, побач з магілай маці яго бацькі. Забойцы трапілі за краты. Айцец Георгій і яго жонка не змаглі перанесці балючай страты. Пасля суда над забойцамі святар з матушкай пераехалі ў Дзятлаўскі раён.

Новым святаром стаў Сава Дзюма. У гэты перыяд, як успаміналі старажылы, у хатах некаторых жыхароў вёскі абнаўляліся іконы. Святар служыў адзін год, а потым яго перавялі ў іншы прыход.

З 1954 па 1965 год настаяцелем царквы быў Мікалай Невяроўскі. Прыхаджане былі незадаволеныя ім, бо бацюшка часамі мог і злоўжываць алкаголем. Улады выкарыстоўвалі непапулярнасць святара ў атэістычнай працы з мясцовым насельніцтвам.

У 1965 годзе царкву закрылі. Уначы на дзвюх калгасных машынах усё царкоўнае начынне, іконы, архіў былі вывезеныя ў іўеўскую лазню і спаленыя. У агні загінулі рэчы, што мелі гістарычную і культурную каштоўнасць. Усяго знішчаны 141 прадмет. Сярод іх – 31 ікона, пісаная алеем на дрэве і палатне (большасць у драўляных пазалочаных рамках, некаторыя – у пасрэбраных рызах), Евангеллі напрастольныя (1857 і 1899 гадоў выдання, трэцяе – невялікага фармату), 9 царкоўных кніг 1857 – 1903 гадоў выдання, камплекты адзення святара, медныя пераносныя ліхтары, падсвечнікі, лампадкі, чашы з медзі, харугвы на сукне і аксаміце з напісанымі іконамі ды іншае.

Калі царкоўную маёмасць загружалі на машыны, у цемры выпадкова ўпала на зямлю ікона Божай Маці. Ранкам яе знайшлі мясцовыя жыхары і захоўвалі ў сябе шмат гадоў. Ікона вярнулася ў царкву на сваё шаноўнае месца ў 1989 годзе, калі царква адрадзілася. Тады ж сюды вярнулі і дзве металічныя харугвы, якія не выкінуў з машыны каля лазні шафёр Іван Батура, жыхар вёскі Крывічы. Ён адвёз іх дадому і для надзейнасці ўтапіў на дне возера, схаваў да лепшых часоў.

Некаторы час будынак царквы выкарыстоўваўся пад калгаснае зернясховішча, а потым быў зачынены на вялізны замок.

У гады перабудовы вёска Морына, як цэнтр калгаса, добраўпарадкавалася. Аднак храм страціў належны выгляд, вакол разрасліся старыя дрэвы і кусты. Райкам партыі, які ўзначальваў Аляксандр Багушэвіч, вырашыў адрамантаваць будынак і размясціць у ім музей. За кароткі тэрмін будынак адрамантавалі. І 7 мая 1988 года тут быў адкрыты музей мясцовага калгаса «Прынёманскі». Сюды былі перанесеныя і экспанаты школьнага гісторыка-краязнаўчага музея.

У час добраўпарадкавання тэрыторыі царквы раённай архітэктурай была допушчаная вялікая недарэчнасць – бульдозерам знеслі амаль усе помнікі (прыкладна 15) і вывезлі на звалку. Магілы пахаваных былі сцёртыя з твару зямлі. У тым ліку і магіла сына святара Г. Ржэцкага. Хто быў пахаваны ў іншых, ужо ніколі не будзе вядома.

У 1989 годзе пасля настойлівых прашэнняў вернікаў будынак царквы быў перададзены ім. Адкрыццё храма праходзіла ўрачыста, было шмат людзей, святароў з іншых прыходаў.

Са студзеня 1990 года настаяцелем прыхода быў Мікалай Уляхін, родам з Пскоўскай вобласці. 28 ліпеня 1992 года Уляхіны выехалі ў іншы прыход Навагрудскага раёна. З 23 лістапада 1992 года святаром пачаў служыць Іван Рэзановіч. У верасні 2002 года ён з сям'ёй пераехаў у вёску Дакудава Лідскага раёна, а пазней І. Рэзановіч узначаліў прыход Свята-Пакроўскай царквы вёскі Мікалаева нашага раёна. З ім аўтару гэтых радкоў даводзілася сустракацца шмат разоў. Ад такіх сустрэчаў засталіся прыемныя ўспаміны.

30 верасня 2002 года ў царкве з'явіўся новы святар – Віктар Завала, які служыць і сёння. Пад яго кіраўніцтвам на сродкі прыхаджанаў над царквою ўстаноўлены новы бліскучы купал з крыжам, устаўленыя новыя вокны.

Храм прыгожы, велічны і ўзнёслы. Цяпер ён скіроўвае вяскоўцаў да веры, любові, душэўнага заспакаення, дае ўпэўненасць у свае сілы, надзею ў заўтрашні дзень.


Царква ў Морыне ў 1925 годзе

*Іван ЗАХАРЭВІЧ,*
*г. Іўе*

# Сто гадоў — за адзін вечар

***Праект Бярэзінскай раённай бібліятэкі «Гісторыя раёна ў суквеццi дат і імёнаў» усё трохгоддзе пад знакам Малой радзімы прапаноўваў землякам цыкл вечарынаў-прысвячэнняў, збіраў аншлагі наведнікаў розных узростаў і роду дзейнасці.***

***Да 100-годдзя камсамола Беларусі была прымеркаваная вечарына «Камсамол Бярэзіншчыны ў тварах і справах». На спатканне з камсамольскай маладосцю былі запрошаныя ветэраны і актывісты камсамольскага руху раёна. Краязнаўча-дасведчаны эмацыйны фармат мерапрыемства дазволіў адлюстраваць без залішняй пафаснасці шматгалоссе лёсаў землякоў, прадставіць гістарычныя падзеі ў канкрэтных, жывых вобразах. Праз відэапрэзентацыю архіўных матэрыялаў і ўспаміны ажыла гісторыя Бярэзіншчыны. Пачынаючы з вытокаў станаўлення (7 ліпеня 1920 г.), на яскравых прыкладах лёсаў удалося паказаць стогадовы перыяд.***

У набатнага звона павінен быць гучны голас. Быць камсамольцам у 1920-я – 1930-я гг. было вельмі рызыкоўна. Навечна першыя – першы камсамолец Бярэзіншчыны, забіты кулакамі ў 1922 г., Мікалай Рыбачонак, і першы сакратар ЦК камсамола Беларусі Леў Герцовіч – ахвяра рэпрэсіяў 1939 г., калі жорсткі махавік крушыў лёсы на самым узлёце.

Маладосць 1941-га, ваеннага, года пачыналася на самай нізкай трывожнай ноце і прадоўжылася на гераічнай. У канцы вайны 180 камсамольцаў узнагароджаныя ордэнамі, звыш 800 – медалямі. Адна з нямногіх партызанскіх сувязных, адзначаных медалём «За адвагу», – вядомая ў раёне піянерважатая з паўвекавым стажам Лізавета Шугалей. Узнагароду атрымала за аперацыю па вывядзенні ў партызанскі атрад былой калгаснай фермы кароў, якіх... абулі ў лапці, для чаго моладзь спляла 140 лапцей.

1950-я – 1960-я гг. назвалі герояў камсамольскіх будоўляў. За 6 гадоў на цаліне пабывалі 275 хлопцаў і дзяўчат Бярэзінскага раёна. Цікавыя факты распавёў Сцяпан Каленцыёнак, які адразу пасля заканчэння школы за кампанію з сябрамі-аднакласнікамі адправіўся ў Казахстан. Спачатку навучаліся ў вучылішчы, спецыяльна пабудаваным для патрэбаў маладых цаліннікаў. У 35-40-градусную спякоту маладыя механізатары ўдзень працавалі ў майстэрні, і толькі позна ўвечары ці ўначы – на ворыве. Казахі адмыслова забяспечвалі цалліннікаў напоем на аснове кумысу. Рукі ад мазуту маладыя механізатары адмывалі саляркай, замест ручнікоў выкарыстоўвалі пілавінне. А хлопец з вёскі Дзевяніца Васіль Ермаловіч – удзельнік Усесаюзнай камсамольскай будоўлі ў Кустанайскай вобласці. Героіку БАМа, калі патрэбна было пабудаваць звыш 1000 км чыгуначнай трасы ў вечнай мерзлаце па Іркуцкай, Чыцінскай, Амурскай абласцях, Бураціі, Якуціі, Хабараўскім краі з перасячэннем 11-і паўнаводных рэк і 7-і горных хрыбтоў, праілюстравала біяграфія Сяргея Валахановіча.

На вечарыне таксама ўзгадвалі імёны лаўрэатаў прэміі Ленінскага камсамола акушэркі Лешніцкага ФАПа Ларысы Цішкевіч і дырэктара Дулебскай школы Мікалая Грудзінскага, уладальніцы Усесаюзнага прыза П. Ангелінай механізатара саўгаса «Камунар» Таццяны Захожай. Памятныя эпізоды розных фестываляў, злётаў моладзі і студэнтаў паўсталі паводле ўспамінаў трактарыста Васіля Гайдука, настаўніц Ады Слабко і Ліліі Казыркі, Марыны Птушко (Мурач) з райпрамкамбіната, члена штаба студэнцкіх атрадаў Мінска Мікалая Грынкевіча. Пра фармаванне лідарскіх задаткаў расказалі старонкі біяграфіяў Надзеі Жукоўскай (Мельнік) і Людмілы Корбут. Рамантыку студатрадаў у Запаляр'і, на Урале і Алтаі спазналі студэнты БПІ Віктар Лашкоўскі і Эдуард Вернікоўскі, навучэнец архітэктурна-будаўнічага тэхнікума Ігар Жукоўскі.

У правінцыі – не значыць на задворках. Важкі ўнёсак моладзі ў грамадска-культурнае жыццё райцэнтра: маладзёжны тэатр, інтэлектуальныя гульні «Што? Дзе? Калі?», маладзёжнае кафэ, клубы маладых жывёлаводаў і маладых сем'яў, аматараў паэзіі, воінаў-інтэрнацыяналістаў, творчае аб'яднанне маладых педагогаў, маладзёжныя фестывалі песні і творчыя абмены з моладдзю горада-пабраціма Кліна (Маскоўская вобласць, Расія), турніры рыцараў, конкурсы «Ану, дзяўчаты!» і «Лідар года», агеньчыкі і камсамольскія вяселлі.

Былі таксама выстава колішняй атрыбутыкі, фотазнімкі былой маладосці, песні пад гітару Мікалая Міхайлоўскага...

*Тамара КРУТАЛЕВІЧ,*
*загадчык аддзела маркетынгу Бярэзінскай раённай бібліятэкі*

# Хамяк, суслік і палятуха ў Беларусі

Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) нядаўна падвяла вынікі экалагічнай ініцыятывы «Хамяк, суслік і палятуха: выратаваць супергрызуноў!». Яна ажыццяўляецца АПБ у партнёрстве з Гарадоцкім лясгасам, эколага-краязнаўчым грамадскім аб'яднаннем «Неруш» і навукова-практычным цэнтрам НАН Беларусі па біярэсурсах і праходзіць у межах праекта «Далучэнне грамадскасці ў экалагічны маніторынг і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні», што фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Дзе ж у Беларусі знайшлі апошніх з гэтых незвычайных звяркоў і што патрэбна для іх захавання?

## Хамяк



Фота Багдана МАРЫНІЦА

Да пачатку ініцыятывы дакладных фактаў сучасных сустрэчаў са звычайным хамяком у Беларусі не было. АПБ удалося сабраць фотадоказы, што гэты звярок яшчэ летась жыў у Бярозаўскім раёне, а ў 2015-м – у Камянецкім. Апытанні мясцовых жыхароў і іх падрабязныя апісанні сустрэчаў з дзікімі хамякамі сведчаць пра верагоднасць таго, што гэты грызун яшчэ захаваўся ў Кобрынскім і Жабінкаўскім раёнах. У Добрушскім раёне людзі таксама добра знаёмыя са звычайным хамяком, але апошні раз апытаныя жыхары назіралі яго некалькі гадоў таму.

Але жылых нораў дзікіх хамякоў эксперты не знайшлі. Пошукі працягваюцца, і АПБ нават абвясціла грашовае ўзнагароджанне да канца года таму, хто знойдзе такую нару ў Беларусі. Гэта шанец захаваць звычайнага хамяка ў нашай краіне.

– Мы вельмі разлічваем на мясцовых жыхароў, – кажа спецыяліст АПБ па сувязях з грамадскасцю Алеся Башарымава. – Калі вы бачыце нару дыяметрам каля 10 см і побач з ёй выкінута шмат зямлі, то гэта можа быць нара хамяка. Сфатаграфуйце яе, паклаўшы побач для маштабу мабільны, і дашліце разам з каардынатамі месца на info@ptushki.org.

Але праблема з ім не толькі ў Беларусі. Колькасць звычайных хамякоў так упала за апошні час, што сёлета від атрымаў новы статус у Міжнародным чырвоным спісе. Ён прызнаны відам, што знаходзіцца пад крытычнай пагрозай знікнення. Гэта значыць, без спецыяльных захадаў ён знікне на Зямлі ў найбліжэйшыя тры дзесяцігоддзі.

## Суслік



Фота Аляксандра ВІНЧЭЎСКАГА

Гэты прыгожы звярок жыве калоніямі. Звычайна ён селіцца на пашах і сельскагаспадарчых палях. Раней суслікаў, як і хамякоў, лічылі ў Беларусі шкоднікамі і масава знішчалі. Сем гадоў таму зніклі адзіныя вядомыя калоніі суслікаў у нашай краіне. Дзякуючы ініцыятыве ўдалося знайсці новыя калоніі ў Нясвіжскім, Капыльскім і Баранавіцкім раёнах. Гэтыя месцы пражывання суслікаў цяпер перадаюцца пад ахову.

Самая вялікая калонія ў Беларусі і адна з самых вялікіх у Еўропе знаходзіцца пад Нясвіжам. Яе плошча складае больш за 90 га, тут жыве больш за 1000 суслікаў!

## Палятуха



Палятуха – «сваячка» звычайнай ваверкі. Самая цікавая яе адметнасць – тое, што яна ўмее планіраваць паміж дрэвамі дзякуючы нацягнутай скуры паміж заднімі і пярэднімі лапкамі.

Эксперты АПБ вызначылі сучасны арэал пражывання палятухі. Аказалася, сустрэць гэтага скрытнага начнога звярка можна на большай частцы Гарадоцкага і Віцебскага раёнаў. Акрамя таго, ёсць дакладная інфармацыя, што палятуха сустракаецца ў Лёзненскім раёне. Таксама дзякуючы мясцовым жыхарам высветлілі, што паўднёвы арэал гэтага звярка не абмяжоўваецца Дзвіной, як лічылася раней: палятуха была адзначаная ў Аршанскім раёне!

Дзякуючы нашым фотапасткам удалося не толькі зняць першае відэа палятухі ў Беларусі, але і высветліць, што гэты грызун вельмі цікаўны і перыядычна правярае ўсе дуплы на сваім участку.

## *Шукаем «супергрызуноў» разам!*

Да пачатку ініцыятывы вельмі мала хто ў нас ведаў, што ў Беларусі можна сустрэць дзікага хамяка, сусліка і палятуху. Цяпер жа дзясяткі тысячаў жыхароў краіны даведаліся пра іх. АПБ прыцягнула да пошуку сотні людзей і атрымала дзясяткі паведамленняў пра сустрэчы з гэтымі відамі.

Каб людзі ведалі, як і дзе шукаць «супергрызуноў», у межах ініцыятывы былі створаныя прэзентацыі, роставыя фігуры ў выглядзе грызуноў, налепкі, буклеты і інтэрактыўная карта. Хаця ініцыятыва заканчваецца, пошукі «супергрызуноў» не спыняюцца. Калі вы ведаеце месца пражывання дзікага хамяка, сусліка або палятухі, адзначайце каардынаты на гэтай карце.

– Сабраныя дадзеныя паказваюць, што папуляцыі ўсіх трох відаў грызуноў у Беларусі значна скараціліся, – адзначае спецыяліст АПБ па прыродаахоўных пытаннях Сямён Левы. – Палятуха, рабы суслік і звычайны хамяк знаходзяцца на мяжы знікнення. Адна з галоўных агульных для іх праблемаў – змяненне ўмоваў пражывання праз гаспадарчую дзейнасць чалавека. Для сусліка гэта разворванне шматгадовых пашаў і прыдарожных палосаў, перавод кароваў на стойлавае ўтрыманне, прыборка бутавых камянёў з ускраінаў палёў. На арэал палятухі моцна ўплываюць высечкі і будаўніцтва лясных дарог, бо гэта фрагментуе стараўзроставыя лясы. Эксперты мяркуюць, што на хамяка негатыўна ўплывае знос нежылых хутароў з садамі каля палёў – там звяркі раней знаходзілі сабе добрыя месцы для нораў. Але ў нас усё яшчэ ёсць шанец захаваць самых рэдкіх грызуноў. Мы падрыхтавалі патрэбныя дакументы для перадачы пад ахову амаль 100 месцаў пражывання палятухі і рабога сусліка. Цяпер адміністрацыі раёнаў павінны прыняць гэтыя ахоўныя дакументы, а землекарыстальнікі – узяць месцы пражывання «супергрызуноў» пад ахову.

*Паводле паведамлення АПБ*

ІІ гістарычны конкурс для моладзі

ПА-ЗА КАДРАМ:
ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці

# Дзядоў і продкаў нашых дух не сцёрся на парозе

***Адыходзяць у нябыт падзеі недалёкага бурнага XX стагоддзя. І мы часцей задаемся пытаннем: а што нас чакае ў будучыні? «Захавай свае карані! Беражы малую радзіму!» – заклікае нас лозунг з тэлеэкрана...***

***2018 – 2020 гады ў Беларусі праходзяць пад знакам малой радзімы. Можна сказаць, што наша краіна, кляновы лісцік на карце свету, убірае ў сябе тысячы мястэчак і вёсак, гарадоў, лёс якіх часта вельмі сумны. Статыстыка палохае лічбамі. З кожным годам усё больш маленькіх населеных пунктаў знікаюць з карты. Жыхары вёсачак перабіраюцца ў гарады да дзяцей. У хатах дзе-нідзе застаюцца старыя людзі, якія не могуць і не хочуць пакідаць свае гнёзды, з якімі звязанае ўсё іх жыццё. Калі едзеш па вясковых дарогах і глядзіш праз вокны аўтамабіля, усё часцей бачыш разваленыя хаты, спустошаныя, закінутыя двары. А што станецца з гэтымі адзінокімі, парослымі мохам хатамі праз пару гадоў? Унукі наведаць сваіх дзядоў выбіраюцца не кожны год. Праўнукі ўжо не маюць да гэтага ніякага дачынення. А дзяржава чакае, чакае з бульдозерам напагатове... І сэрца сціскаецца з нясцерпнага болю, бо нечы родны куток знікне з твару зямлі... А тут раней чуўся вясёлы дзіцячы гоман, нечыя моцныя рукі з раніцы працавалі з рыдлёўкай, касой, плугам, і нават праз старыя ліштвы цягнуўся пах свежаспечанага хлеба. А дзе гэта ўсё цяпер? На жаль, толькі ў памяці гэтых людзей, у фотаздымках, ды і то недзе вельмі глыбока, за ўсімі сучаснымі праблемамі і надзённымі справамі.***

Вёска Гуменікі Слонімскага раёна – месца, дзе засталася хата прадзеда і прабабулі, могілкі, дзе пахаваныя родныя. Шкада толькі, што паступова знікае яна: летась тры дамы закапалі, сёлета яшчэ адзін, у пажары згарэла яшчэ адна хата. А месца гэта добрае: тут праведзены газ, ёсць водаправод, святло. У нашай хаце ўжо ніхто не жыве з 2007 года. Бабуля параілася са сваякамі і ўжо рыхтавалася да продажу, нават некалькі пакупнікоў прыехалі, грошы падрыхтавалі. Але ў апошні момант яна передумала прадаваць дом, у якім жыве дух яе роду, і цяпер сюды прыязджаем толькі ўлетку. Пад час уборкі на гарышчы я знайшла скрутак, загорнуты ў газету, а там – старыя паштоўкі, лісты. У шафе мне трапілі ў рукі акуратна згорнутыя сямейныя дакументы, узнагароды сваякоў. Самым вялікім адкрыццём для мяне сталі фотаздымкі ў старым альбоме.

Пераглядваю пажоўклыя ад часу здымкі, часта задаю бабулі розныя пытанні. Мне 22 гады, я студэнтка, а на невялікай картачцы мой прадзед –Андрэй Рыгоравіч Севасцьян, 1925 года нараджэння, а па дакументах 1923-га (стаіць у першым шэрагу ў цэнтры). Наш узрост амаль супадае, яму прыкладна столькі ж, колькі мне цяпер. Дзед самы высокі сярод юнакоў, апрануты прыстойна, у рабочым адзенні, як і астатнія: галіфэ, кірзавыя боты, фрэнч, кашуля, на галаве кепка з брылём. Няма трывогі на іх тварах, адна нага выстаўленая наперад, адчуваецца спакой, упэўненасць, гонар. Але гэта не зусім так. Бабуля мне расказала, што напярэдадні вайны дзед Андрэй, калі рамантаваў разам з напарнікам вучэбны трактар, пашкодзіў сухажыллі на пальцах правай рукі, і пальцы засталіся на ўсё жыццё перабітымі. Таму ў ваенкамаце прадзеду далі браню, не прызвалі на фронт. Пасляваенны час. Трактарыстаў у СССР шанавалі, іх лічылі адукаванымі людзьмі. Напрыклад, у прадзеда адукацыя – 4 класы польскай школы, 6 класаў Глоўсевіцкай няпоўнай сярэдняй школы. Прыйшоў час выбіраць свой далейшы жыццёвы шлях. Прага працаваць на зямлі стала вызначальнай. І вось ужо яны – маладыя спецыялісты, трактарысты. Ім давяраюць СХТЗ-НАЦІ – першы гусенічны трактар айчыннай распрацоўкі.

Пад час працы ў Навагрудскім занальным архіве знайшла дакументы, якія сведчылі, што 10 студзеня 1945 года прадзед уладкаваўся ў Слонімскую МТС, што знаходзілася ў в. Грыбава, у якасці вучня трактарыста (трактар У-1, У-2). Яго заробак за 1945 год вагаўся (залежала ад сезона, аб'ёму, характару выкананай працы): 85 руб., 65 руб., 105 руб., 236 руб., 210 руб., 40 руб., 60 руб., 2 руб. Зарплата за 1946 складала: 150 руб., 40 руб., 25 руб., 65 руб., 83 руб., 30 руб., 47 руб. Для параўнання, заробкі супрацоўнікаў МТС: дырэктар – 700 руб., аграном – 400 руб., загадчык гаража – 275 руб., старшы механік – 650 руб., ахоўнік – 140 руб., шафёр – 300 руб., брыгадзір – 240 руб., прыбіральшчыца – 130 руб., кухар – 150 руб. Гэта ў часы, калі калгаснікі працавалі за працадні, атрымлівалі ў канцы года натуральнымі прадуктамі.

Звольніўся з МТС прадзед у 1947 годзе па сямейных абставінах, бо памёр бацька. Дома на немалой на той час гаспадарцы засталіся маці, стары дзед, дзве малалетнія сястры і брат. Вярнуўся ў вёску дапамагаць, неўзабаве ажаніўся з маёй прабабуляй, Лідзіяй Навумаўнай Хрэшчык, 1926 года нараджэння, праз год нарадзіўся першынец Мікалай.

Самым складаным было першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. 1 студзеня 1945 года была прынятая Пастанова ЦК КПБ аб адраджэнні сельскай гаспадаркі. У ёй было прадугледжана ўсё, акрамя галоўнага – фінансавай падтрымкі сялянаў і калгасаў. Планы нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі былі завышаныя. Захавалася сярод сямейных дакументаў паведамленне ад 10.01.1957 года за подпісам рай(гар)фінаддзела і старшага падатковага інспектара на ўплату падатку ў памеры 116 руб., абавязковай пастаўцы мяса – 30 кг, малака – 100 л, яек – 50 шт., воўны, свіных скур – 1 шт., бульбы – 130 кг. Другі дакумент 1967 года – здаць дзяржаве цяля 4-тыднёвага ўзросту, парася ў 8-тыднёвым узросце. На працягу многіх гадоў сяляне не атрымлівалі за працадні нічога, бо дзяржава забірала ўсё. Каб выжыць, яны апрацоўвалі любыя кавалачкі зямлі. Многія працавалі па найме на будоўлі. Але супраць заможных гаспадароў улада прымяніла рэпрэсіі, цэлымі сем'ямі вывозілі ў Казахстан, на Поўнач СССР. У адпаведнасці са сталінскай тэорыяй калектывізацыі (у Заходняй Беларусі яна пачалася ў 1939-м і не была завершаная ў сувязі з пачаткам вайны, працяг яе адбыўся пасля вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў) стварэнне калгасаў павінна было суправаджацца ліквідацыяй заможных гаспадарак. Але іх было нямнога, таму ўдар прыйшоўся па серадняках, самых дбайных гаспадарах, якія нават у вайну захавалі пабудовы, жывёлу, інвентар. Таму пасля вайны шмат бежанцаў са Смаленскай, Бранскай абласцей пераехалі ў заходнюю частку БССР, каб не памерці з голаду. Так «дзякуючы» калектывізацыі быў вынішчаны клас руплівых і дбайных сялянаў. Нараджаліся новыя стасункі ў вёсцы. Замест гаспадароў з'явіліся «временщики», яны разбурылі ранейшы лад жыцця, размылі найлепшыя якасці сельскіх гаспадароў. Што, на жаль, мы часам назіраем і да гэтага часу...

У 1950 годзе на Слонімшчыне была арганізаваная Рышчыцкая МТС. І мой прадзед 10 чэрвеня таго ж года ўладкаваўся туды брыгадзірам. Пад яго кіраўніцтвам былі 4 трактарысты, якія працавалі на ДТ-54 і ХТЗ. Сам ён працаваў на ДТ-54, трактары новага пакалення. Як сведчаць архіўныя дадзеныя з Навагрудскага занальнага архіва, прадзед быў пераможцам сацыялістычных спаборніцтваў паміж брыгадамі Рышчыцкай МТС па многіх паказчыках.

Маё здзіўленне выклікаў наступны факт з пратакола Савета Рышчыцкай МТС ад 26 сакавіка 1952 года: з 1947 – 1948 гадоў найлепшыя землі аддаваліся пад пасевы кок-сагызу (сыравіны для вытворчасці айчыннага каўчуку), а месца другому «хлебу» – бульбе, не знаходзілася (толькі 16,9 % пасяўных плошчаў, слабая ўраджайнасць – 53,3 ц з га). Адпаведна, гэта не спрыяла паспяховаму развіццю жывёлагадоўлі БССР.

12 студзеня 1952 года адбыўся агульны сход калгаснікаў калектыўных арцеляў імя Суворава (в. Сурынка), імя Сталіна (в. Рахавічы), імя Леніна (в. Гуменікі), «Зара Камунізму» (в. Забулле), на якім было прынятае рашэнне ўзбуйніць, аб'яднаць гэтыя калектывы ў агульную гаспадарку – калгас імя Суворава з цэнтрам у в. Сурынка. Першым старшынёй быў абраны Г. Зайцаў. 15 чэрвеня 1952 года да калгаса Суворава далучылася арцель «Бальшавік» (в. Падмошша).



***(Заканчэнне на стар. 10)***

*Наш каляндар*

**Зыгмунт Глогер – археолаг, этнограф, гісторык, фалькларыст, даследчык матэрыяльнай і духоўнай культуры Польшчы, Беларусі, Літвы – 175 гадоў з дня нараджэння.**

Зыгмунт Глогер нарадзіўся 3 лістапада 1845 г. у в. Тыборы-Камянка, што на Падляшшы. Прадстаўнік шляхецкага роду герба «Прус». У 1867 г. скончыў Варшаўскую галоўную школу. У наступным годзе паступіў на гісторыка-археалагічнае аддзяленне Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве. Скончыў яго ў 1870 г. З таго часу жыў у маёнтку Яжава пад Тыкоцінам.

Сабраў у сваім маёнтку багатую бібліятэку, вялікую музейную калекцыю археалагічных, этнаграфічных, археаграфічных, нумізматычных і сфрагістычных матэрыялаў. Тут захоўваліся беларускія матэрыялы са збораў М. Федароўскага, А. Кіркора, К. і Я. Тышкевічаў, А. Ельскага і інш. У яго «Старапольскай энцыклапедыі» (т. 1 – 4, 1900 – 1903, 5-е выд. 1985) каля 1000 ілюстрацыяў, шматлікія беларускія матэрыялы па гісторыі, геаграфіі, драўлянай і мураванай архітэктуры, кнігадрукаванні, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, якія З. Глогер збіраў і даследаваў усё жыццё.

Першыя этнаграфічныя працы пачаў яшчэ ў 1867 г.



Пазней ажыццявіў шматлікія паездкі з мэтай правядзення этнаграфічных і археалагічных даследаванняў па землях Польшчы, Беларусі і Літвы. Ён арганізатар і першы старшыня Польскага краязнаўчага таварыства ў Варшаве.

Тлумачыў этнаграфію як адну са спецыяльных гістарычных дысцыплінаў, шырока выкарыстаў у этнаграфічных даследаваннях гісторыка-параўнальны метад. Яго працы грунтаваліся на матэрыялах, сабраных пад час комплексных краязнаўчых даследаванняў зямель і насельніцтва Падляшша.

У археалагічных даследаваннях вучонага цікавілі помнікі каменнага і бронзавага вякоў. Праводзіў раскопкі на Гродзеншчыне і Брэстчыне, удзельнічаў з М. Федароўскім у археалагічных і этнаграфічных экспедыцыях.

Член гістарычнай, археалагічнай і антрапалагічнай камісіяў пры Кракаўскай акадэміі ведаў. Удзельнічаў у падрыхтоўцы многіх энцыклапедыяў, арганізоўваў навуковыя публікацыі. Сабраную за доўгія гады калекцыю, бібліятэку і архіў завяшчаў Кракаўскаму і Варшаўскаму этнаграфічным музеям, таварыствам краязнаўства і бібліятэцы ў Варшаве.

Большасць этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў апублікаваў на старонках польскіх штотыднёвікаў, календароў і часопісаў. Так, у трох тамах «Wisły» (1889, 1896, 1898) друкаваліся артыкулы пра прыказкі, песні, што суправаджалі хрысціянскія і пахавальныя абрады ўкраінцаў. На старонках «Biblioteki Warszawskiej» змяшчаў матэрыялы па каляндарныя абрады.

З. Глогер – аўтар каля 800 навуковых працаў і артыкулаў. Яго галоўная праца «Geografia historyczna ziem dawnej Polski» («Гістарычная геаграфія зямель старажытнай Польшчы», 1900; тут змешчаны і матэрыялы пра ВКЛ, Беларусь) ініцыявала шырокія даследаванні ў галіне спецыяльных гістарычных дысцыплінаў. Сярод іншых працаў «Вясельныя ўрачыстасці» (1869), «Песні люду» (1892), «Кніга рэчаў польскіх» (1896), «Польскі год у жыцці, традыцыі і песні» (1900), «Драўлянае будаўніцтва і вырабы з дрэва ў даўняй Польшчы» (1907 – 1909) і інш. Выдаў зборнік фальклору «Старадаўнія думы і песні», «573 кракавякі» (абодва ў 1877), «Гадавыя звычаі» (1882) і інш. Карыстаўся псеўданімамі Pruski, Prus, Ziemianin, Sąsiad, Hreczkosiej.

Пра жыццё, звычаі, абрады і вераванні беларускага народа пісаў у артыкулах «Земляробчыя абрады» (1867), «Звычаі народа з ваколіц Тыкоціна і Бельска» (1868), «Забабоны і ўяўленні наднарвенскага люду пра птушак, паўзуноў і насякомых» (1877) і інш. Беларускія матэрыялы і ў працах пра краязнаўчыя падарожжы (кніга «Далінамі рэк: Апісанні падарожжа ўздоўж Нёмана, Віслы, Буга і Бебжы», 1903; артыкулы «З-над Нёмана», 1872; «Падарожжа Нёманам», 1888; «На хвалях Буга», 1890; «У даліне Бебжы», 1892, інш.).

Акрамя таго, З. Глогер выдаў без подпісу некалькі кніжак для народнага чытання, а ў 1879 г. пад назвай «Народная Бібліятэка» – тры кніжкі: «Krakowiaki», «Kujawiaki i Mazurki», «Baśni i powieści», потым у 1880-м «Gody weselne», «Marzenia samotnika» (1883), «Zabawy, gry, zagadki, żarty i przypowiescі» (1886) і інш. Некаторыя яго працы перакладзеныя на нямецкую мову і выдадзеныя ў «Materialen zur Vorgeschichte des Menschen» (1879).

Памёр З. Глогер 15 жніўня 1910 г. у Варшаве. Там і пахаваны на могілках Старыя Павонзкі.

З 1983 г. у Польшчы праводзіцца конкурс і заснаваны медаль імя Зыгмунта Глогера за асаблівыя дасягненні ў даследаванні, ахове і развіцці культуры.







*Па-за кадрам*

# Дзядоў і продкаў нашых дух не сцёрся на парозе

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на стар. 9)***

Тым часам сям'я прадзеда павялічылася, у 1952 годзе нарадзіўся яшчэ адзін сын – Міхаіл. Прабабулі стала складаней спраўляцца па гаспадарцы, і яны прынялі рашэнне, каб прадзед перавёўся працаваць бліжэй да вёскі ў калгас імя Суворава. У 1955 годзе ў сям'і з'явілася дачушка Валянціна, мая бабуля. З 1952 па 1983 гады (да пенсійнага ўзросту) прадзед плённа працаваў трактарыстам (на Т-74, культыватары) у гэтай гаспадарцы.

Чалавек працоўнай славы – так называлі майго прадзеда родныя і знаёмыя. Працуючы нязменна механізатарам і выконваючы штогод гадавы план, прадзед быў у аб'ектыве карэспандэнтаў слонімскай раённай газеты «За перамогу камунізму», рэспубліканскай газеты «Сельская газета». У 1980 годзе праўленне калгаса імя Суворава вырашыла найлепшым калгаснікам за высокія паказчыкі прадаставіць турыстычную паездку на тыдзень у Маскву за кошт калгаса. Сярод іх быў і мой прадзед.

У скарбонцы з дакументамі ляжалі ўзнагароды, граматы прадзеда за шматгадовую добрасумленную працу. Колькі званняў, узнагародаў і падзяк ён атрымаў за гады сваёй працы! Знак «Выдатнік сацыялістычнай сельскай гаспадаркі», ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, медаль «Ветэран працы», Ганаровая Ленінская грамата. У 1983 годзе стаў пераможцам раённага сацспаборніцтва і быў занесены на раённую Дошку гонару. Ён уславіў сваёй працай зямлю, якая яго ўзгадавала, сваю Слонімшчыну. Свой досвед працы перадаваў моладзі, выхаваў любоў да зямлі ў сваіх дзяцей. Сын Мікалай скончыў Навагрудскі сельскагаспадарчы тэхнікум, пазней – Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, факультэт аграноміі, працаваў старшынёй калгаса, дырэктарам саўгаса на Астравеччыне; сын Міхаіл – Жыровіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум і Мазырскі педагагічны інстытут, працаваў выкладчыкам навучальна-вытворчага камбіната ў г. Свіслач Гродзенскай вобласці па спецыяльнасці «трактарная справа»; дачка Валянціна (мая бабуля) скончыла Ваўкавыскі саўгас-тэхнікум па спецыяльнасці «заатэхнія», зяць Генрых (мой дзядуля) пасля заканчэння Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута па размеркаванні прыехаў у калгас імя Суворава, дзе і сустрэўся з маёй бабуляй. Так назаўжды і застаўся на Слонімшчыне.

Мой прадзед быў не толькі добрым працаўніком, але і добрым чалавекам, любімым сынам, мужам, бацькам, дзядулем. Калі б трэба было ў некалькіх словах расказаць пра А. Севасцьяна, хапіла б простага: ён любіў жыццё, і яно адказвала яму ўзаемнасцю. Добразычлівы і з вялікім пачуццём гумару чалавек, душа кампаніі. Ніколі не падняў рукі на сваіх дзяцей, было дастаткова слова і позірку бацькі, яго разумелі сыны і дачка. Ведаў на памяць шмат вершаў па-польску і з задавальненнем вучыў сваіх дзяцей і ўнукаў. Дзеці заўсёды чакалі яго з працы, бо ў кішэні заўжды быў зайчыкаў хлеб. Аднак лёс не заўсёды быў да яго літасцівы. Жыццё неаднойчы выпрабоўвала на трываласць, вучыла ні ў якім разе не здавацца. Глядзіш на яго партрэт, слухаеш пра яго, пераглядаеш фотаздымкі і разумееш, што і лёсам можна кіраваць. Чалавек не выбірае час – калі жыць, алё ён выбірае – як яму жыць, і ствараць добрае, багатае, раднае жыццё. Безумоўна, лёгка не будзе, але скарацца ні ў якім разе нельга.

Фатаграфія – гэта сіла, сіла схопленага імгнення, настрою, атмасферы, перыяду гісторыі. Гісторыя жыцця маёй сям'і захоўваецца ў фатаграфіях, што месцяцца не толькі ў сямейных альбомах, але і ў рамках на сценах вялікага пакоя. За кожнай з іх карпатлівая і адданая праца гэтых людзей, вядомыя і невядомыя старонкі гісторыі беларускай вёскі.

*Часам я прыязджаю ў вёску,*
*Дзе дзяцінства маё прайшло.*
*Пеўняў ранніх чуваць адгалоскі –*
*Я хачу, каб заўжды так было.*
*...Сэрца радуе клёкат бусліны,*
*Іх вяртанне ў сваё жытло.*
*Вёска стому і болі здымае –*
*Я хачу, каб заўжды так было!*

Бацькоўскі дом – гэта тое месца, у якое вяртаешся, нягледзячы ні на што. І людзі, як птушкі, дзе нарадзіліся, павінны вяртацца ў свае бацькоўскія гнёзды. Тады будзе што пакінуць нашчадкам, тады не парвецца повязь пакаленняў.

***Паліна БАРЫСІК,***
***студэнтка перакладчыцкага факультэта МДЛУ***

**Даведка.** МТС – машына-трактарныя станцыі, буйныя дзяржаўныя прадпрыемствы ў сельскай гаспадарцы СССР, забяспечаныя сучаснай на той час тэхнікай – трактарамі, камбайнамі і іншымі сельскагаспадарчымі машынамі і абсталяваннем. Створаныя як апорныя пункты дзеля сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі на сучаснай тэхнічнай базе і дасягненнях сучаснай навукі. З дапамогай МТС дзяржава ажыццяўляла кіроўную ролю ў дачыненні да калгасаў, спалучаючы кіраўніцтва, арганізацыйную і вытворча-тэхнічную дапамогу з самастойнасцю дзеля арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў.

**Ад рэдакцыі.** «КГ» сумесна з арганізатарамі конкурсу плануюць адзін са снежаньскіх нумароў газеты цалкам прысвяціць конкурсу «Па-за кадрам».

## Лістапад

**14 – Кін-Камінскі Уладзімір Тадэвушавіч** (1950, Мінск – 1995), акцёр, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1993) – 70 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Чарнушэвіч Нічыпар Тодаравіч** (1900, Капыль – 1967), паэт, перакладчык на беларускую мову твораў рускіх, украінскіх, яўрэйскіх паэтаў – 120 гадоў з дня нараджэння.

**16 – Белавусаў Алег Паўлавіч** (1945, Слуцк – 2009), мастацтвазнаўца, дзеяч кінамастацтва, сцэнарыст, рэжысёр, заснавальнік і мастацкі кіраўнік майстэрні мультфільмаў кінастудыі «Беларусьфільм», анімацыйных студыяў – 75 гадоў з дня нараджэння.

**18 – Андрэева Юлія Яўсееўна** (1960), музычны дзеяч, музыказнаўца, журналіст – 60 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П.В. Масленікава** (1990) – 30 гадоў з часу адкрыцця.

**20 – Ігнаценка Рыгор Канстанцінавіч** (1930, Касцюковіцкі р-н), пісьменнік, аўтар шматлікіх твораў для дзяцей і дарослых – 90 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Ткачонак Аляксандр Леанідавіч** (1950, Чашнікі), акцёр тэатра і кіно, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986), прэміі Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка» (2012) – 70 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Дзянісаў Міхаіл Іванавіч** (1900 – 1971), артыст оперы, народны артыст Беларусі – 120 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Шаг-Наважылаў (сапр. Наважылаў) Анатоль Сяргеевіч** (1910 – 2007), артыст цырка, ілюзіяніст, заслужаны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**23 – Змітрок Астапенка (Дзмітрый Емяльянавіч**; 1910, Мсціслаўскі пав. – 1944), паэт, перакладчык, які стаяў каля вытокаў беларускай навукова-фантастычнай літаратуры, – 110 гадоў з дня нараджэння.

**23 – Міронаў Аляксандр Яўгенавіч** (1910, Орша – 1992), пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**23 – Ярмоліна Ларыса Аляксандраўна** (1900, Мазыр – 1984), актрыса, тэатральны дзеяч, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 120 гадоў з дня нараджэння.

**24 – Ермалаеў Уладзімір Аляксеевіч** (1960, Мінск), ваенны дырыжор, заслужаны артыст Беларусі – 60 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Красінскі Анатоль Віктаравіч** (1930, Круглае), кіназнаўца, кінакрытык, адзін з заснавальнікаў нацыянальнай школы кінакрытыкі, лаўрэат прэмій Саюза кінематаграфістаў СССР (1981), Беларускага саюза кінематаграфістаў (1988), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (1999) – 90 гадоў з дня нараджэння.

**26 – Алімаў Леў Барысавіч** (1945, Брэст), мастак, які працуе ў станковай і кніжнай графіцы, экслібрысе, ганаровы акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

**26 – Караткевіч Уладзімір Сямёнавіч** (1930, Орша – 1984), пісьменнік, перакладчык, крытык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1984), Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1983) – 90 гадоў з дня нараджэння.

**27 – Пукст Рыгор Канстанцінавіч** (1900, Гомель – 1960), кампазітар, аўтар першай беларускай оперы для дзяцей «Марынка», заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, кавалер ордэна «Знак Пашаны» – 120 гадоў з дня нараджэння.

**27 – Слуцкі збройны чын (1920)**, паўстанне з мэтаю абароны непадзельнасці Беларусі ў яе этнічных межах, усталявання рэспублікі і прызнання БНР, а таксама незалежнасці ад Польшчы і Расіі – 100 гадоў з пачатку.

**28 – Асторына Аляксандра Паўлаўна** (1900 – 1982), актрыса, рэжысёр, заслужаная артыстка Беларусі, адна з арганізатараў Брэсцкага абласнога тэатра лялек – 120 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Кузьміч Мікалай Пятровіч** (1950, Кобрынскі р-н), мастак-ювелір, стваральнік копіі напрастольнага Крыжа, стаўратэкі і ракі прападобнай Ефрасінні Полацкай, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998), прэміі «За духоўнае адраджэнне» (1997), прэміі «Берасцейская зорка» (1997), Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва (2017), узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны – 70 гадоў з дня нараджэння.

**29 – Паўстанне 1830 – 1831 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве (Лістападаўскае паўстанне)**, нацыянальна-вызваленчае паўстанне – 190 гадоў з пачатку.

# «Над быстрым Дняпром...»



***Уздоўж***

**1**. Прыстасаванне для плавання. **8**. «Над быстрым Дняпром, дзе сягодня // Стаяць Магілёва муры». З паэмы Янкі Купалы «... льва». **9**. «І вішнёвыя ... глядзяцца ў шырокі Дняпро». З верша У. Караткевіча «Беларуская песня». **10**. Каралавы востраў кольцападобнай формы. **12**. Месца ў рацэ з самым хуткім цячэннем. **15**. Адпраўленне па цячэнні ракі. **16**. «Не раве, не стогне Днепр шырокі. // ... ў Кіеў па рацэ плывуць». З верша П. Панчанкі «Успамін». **17**. Кругі, дугі вакол Сонца ці Месяца. **18**. «... паважныя і карпы, // Што тыя зебры, – акуні». З верша П. Броўкі «На рыбалцы». **19**. ... акуню не таварыш (прык.). **22**. Тое, што і вепр. **23**. Хлебаробчае восеньскае свята; «Выйдзем на ... мы // Да Дняпра шырокага». З верша З. Крэчата «Бацька Дняпро». **26**. Затор лёду ў русле ракі пад час ледаходу. **28**. Назва Дняпра ў славянаў. **31**. «...Нырне – ... над ракою // Бурбалкі варам клякочуць». З балады А. Міцкевіча «Рыбка». **32**. Статуй, якому пакланяліся як бажаству. **33**. «Рэдкая ... даляціць да сярэдзіны Дняпра». З аповесці М. Гогаля «Страшная помста». **34**. ... з вадой – не гара з гарой: сальюцца (прык.).

***Упоперак***

**2**. Ручаі сальюцца – рэкі, людзі аб'яднаюцца – ... (прык.). **3**. Мужчынскі галаўны ўбор. **4**. Невялікі флаг. **5**. «Як паймаў дзед шчуку, // Баба кажа: ...!». З беларускай народнай песні «Пасеяў дзед грэчку». **6**. Верасню і ... рады (прык.). **7**. «Пад небам Валдая // Кіпіць ля двара // Крыніца – малая ... Дняпра». З верша А. Вялюгіна «Бацька Дняпро». **11**. Грунт пад вадой ракі, возера. **13**. Імя кіеўскага князя, які ў канцы XX стагоддзя хрысціў у Дняпры Русь. **14**. Горад ва Украіне, дзе знаходзіцца самая вялікая на Дняпры плаціна. **20**. Адтуліна ў плаціне для сцёку лішняй вады. **21**. Старажытнагрэчаскі вучоны, які ў V стагоддзі да нашай эры называў Дняпро Барысфенам; у старажытных рымлянаў рака насіла назву Данапрыс. **24**. Жаданне, імкненне. **25**. Кавалачак лісціка сухога або заваранага чаю. **27**. Лясны жаваранак. **29**. Ручай поіць раку, ... поіць мора (прык.). **30**. Імя міфічнага князя; паводле падання, па слядах яго любімых сабак Стаўры і Гаўры пацяклі рэкі Дняпро і Дзвіна.

*Склаў Лявон ЦЕЛЕШ*

*Дзе варта пабываць*

## Каляды ў музеі

Нястрымна набліжаецца зіма, а разам з ёю і калядныя святы. Каб наступны год быў шчаслівейшым за папярэдні і цяперашні, мы прапануем сустрэць яго ў адпаведнасці са старадаўняй беларускай традыцыяй: весела і шумна. Здаўна адным з галоўных святаў года было Хрыстова Нараджэнне. Яго нашыя продкі сустракалі вясёлай кампаніяй «калядоўшчыкаў». Можа, і нам варта паспрабаваць?

У Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах (Мінскі раён) мы прапануем наведнікам не толькі паглядзець калядны абрад, але і самім стаць яго ўдзельнікамі. Дапаможа ў гэтым дзіцячы фальклорны гурт «Бараўлянская крынічка». Як калісьці нашыя продкі на вячорках, будзем танчыць традыцыйныя танцы ды гуляць у вясёлыя гульні. А напрыканцы абавязкова выпʼем гарбаты са смачным блінам і хатнім сочывам.

А каб ад Калядаў у музеі народнага мастацтва засталіся не толькі яркія ўспаміны ды фотаздымкі, на майстар-класе па саломапляценні кожны ўдзельнік самастойна зробіць каляднага анёла. Гэта стане цудоўным напамінам аб сустрэчы ў музеі. Анёлам можна ўпрыгожыць хатнюю навагоднюю елку.

Вядома ж, трапіўшы ў музей, экспазіцыя якога напоўненая скарбамі традыцыйнага мастацтва, нельга абысціся без экскурсіі. Навуковыя супрацоўнікі музея распавядуць пра тыя віды народнай творчасці, што з’яўляюцца асновай для фармавання сучаснага беларускага выяўленчага мастацтва.

У праграме запланаваныя:
- транспарт ад школы да музея і назад;
- экскурсія;
- майстар-клас па саломапляценні;
- выступленне калядоўшчыкаў;
- майстар-клас па традыцыйных танцах;
- народныя гульні;
- пачастунак (гарбата, блінцы з сочывам).

Кошт праграмы 29 рублёў на чалавека (кошт залежыць ад колькасці ўдзельнікаў у групе).

Папярэдні запіс абавязковы па тэлефонах: +37517 5074469 і +37529 1353241 (Viber, WhatsApp).

***Паводле паведамлення Музея беларускага народнага мастацтва***


Фота Наталі КУПРЭВІЧ

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

*(Пачатак у № 1 за 2003 год)*

**ПРЫГО́ДНІЦКІ ФІЛЬМ** – твор кіна- і тэлемастацтва, для якога характэрныя вострыя фабулы, займальнасць, выключнасць падзеяў, пакладзеных у аснову сюжэта, імклівасць развіцця дзеяння, асаблівыя сюжэтныя сітуацыі, матывы (небяспека, выкраданні і праследы, пагоні, загадкі, тайны). Тэматыкай цесна звязаная з дэтэктыўным фільмам, навуковай фантастыкай. Існуюць жанравыя разнавіднасці прыгодніцкага фільма: героіка-прыгодніцкі, дэтэктыўна-прыгодніцкі, навукова-фантастычны, а таксама трымценнік (трылер), вестэрн, фільм катастрофаў, жахаў, гангстарскі і інш.

У першыя гады беларускага кінематографа стварaліся героіка-прыгодніцкія фільмы на матэрыяле грамадзянскай вайны: «Лясная быль» (1926, рэж. Ю. Тарыч) і «Хвоі гамоняць» (1929, рэж. П. Малчанаў). Пазней былі створаныя стужкі, у шэрагу якіх за аснову ўзяты гістарычны грунт: «Палескія рабінзоны» (1935, рэж. І. Бахар, Малчанаў), «Міколка-паравоз» (1957), «Дзяўчынка шукае бацьку» (1959), «Анюціна дарога» (1968) і «Паланэз Агінскага» (1971, рэж. усіх Л. Голуб). Прыгодніцкая і гістарычная фабула ёсць ў кіна- і тэлефільмах «Дзяржаўная граніца» (1980, 1982, рэж. Б. Сцяпанаў), «Чорны замак Альшанскі» (1984, рэж. М. Пташук), «Тры талеры» (2005, рэж. І. Чацверыкоў), «Масакра» (2010, рэж. А. Кудзіненка ) ды інш. Тэндэнцыя стварaць на аснове прыгодніцкай фабулы фільм складанага філасофскага жанру, часцей за ўсё прытчу, выявілася, напрыклад, у фільме «Дзікае паляванне караля Стаха» (1980, рэж. В. Рубінчык).

**ПРЫГО́ЖАЕ** – асноўная катэгорыя эстэтыкі для вызначэння станоўчых паводле зместу і дасканалых паводле формы з'яваў прыроды, грамадскага быцця і мастацтва, што адпавядаюць сацыяльна абумоўленым эстэтычным ідэалам народа, нацыі, грамадства і яго асобных класаў. У якасці эстэтычнай каштоўнасці ўключае ў аб'ект станоўчай ацэнкі, апрача эстэтычных аб'ектаў рэальнасці і мастацтва, таксама ісціну і дабро, але адрозніваецца ад тэарэтычных і маральных каштоўнасцяў пачуццёвай выяўленасцю, злучанасцю з вобразнай формай. Суадносіцца з узнёслым і трагічным, камічным, процілеглае агідназму, нізкаму. У рэалістычным мастацтве прыгожае з'яўляецца ідэалам, з якім суадносіцца і мерай якога ацэньваецца адлюстраваная ў вобразах рэальнасць.

Аб'ектыўная аснова прыгожага – самакаштоўнасць, унутраная мэтазгоднасць прадметаў і з'яваў рэчаіснасці, іх дасканаласць і сувымернасць; суб'ектыўнай жа ўмовай узнікнення пачуцця прыгожага з'яўляецца іх успрыманне як каштоўнасцяў, што прыносяць духоўную асалоду і радасць не толькі ў якасці сродкаў узнікнення гэтых пазітыўных эмоцыяў, але і самім фактам свайго існавання. Адрозніваюць 3 аспекты прыгожага – псіхалагічны (успрыманне прыгожага), творча-пераўтваральны (стварэнне прыгожага, або мастацтва) і навукова-тэарэтычны. Першыя два характэрныя ўсім этапам развіцця чалавецтва, пачынаючы ад першабытнаабшчыннага грамадства.

У гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі першае паняцце аб прыгожым як духоўнай каштоўнасці ўзнікла ў сінкрэтычнай культуры сярэднявечча, заснаванай на непадзельнасці красы з ісцінай і дабром, аб'яднаных універсальнай катэгорыяй праўды. Цэнтральнай праблемай эстэтыкі сярэднявечча было пытанне пра яе крыніцу; у царкоўна-хрысціянскай літаратуры (Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, зб. «Пчала», «Дыоптра, або Люстэрка жыцця» і інш.) яе вытокі шукалі ў Богу – духоўнай аснове і сэнсе жыцця; выяўленая ў фальклоры і інш. формах народнага мастацтва стыхійна-матэрыялістычная эстэтыка бачыла яе ў прыродных пачатках (у сонцы, святле, вадзе, зямлі, у іх увасабленнях і сімвалах). Традыцыйныя народныя ўяўленні аб прыгожым, адлюстраваныя ў вуснапаэтычнай творчасці, прайшлі праз вякі і захаваліся ў сучасным нацыянальным фальклоры. Ва ўзаемадзеянні з імі развіваліся прафесійныя формы літаратуры, выяўленчага мастацтва і эстэтычнай думкі. У творчасці дзеячаў беларускага Адраджэння XVI ст. (Ф. Скарына, М. Гусоўскі, В. Цяпінскі, С. Будны і інш.) яно выявілася ў асветніцкіх уяўленнях пра грамадскі ідэал, гармонію асабістых, народных і агульначалавечых інтарэсаў, адзінстве ісціны, дабра і красы. Для беларускай літаратуры і мастацтва барока (2-я палова XVII – пачатак XVIII ст.) характэрная трактоўка прыгожага як выніку творчай фантазіі, што мыслілася па аналогіі з боскай стваральнай патэнцыяй. У эстэтыцы класіцызму адраджаецца антычны погляд на прыгожае як гармонію, меру і дасканаласць, вечны ўзор для наследавання.

У мастацтве беларускія нацыянальна спецыфічныя ідэалы красы ўпершыню адкрылі пісьменнікі і фалькларысты Я. Баршчэўскі, Б. Дунін-Марцінкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, І. Храпавіцкі, Я. Чачот і інш., а ўсебакова распрацавалі Ф. Багушэвіч, К. Каліноўскі, Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч і іх паслядоўнікі.

У Беларусі вызначыліся 3 кірункі даследавання катэгорыі прыгожага: узнаўленне яго разнастайных формаў выяўлення ў гісторыі беларускай эстэтычнай думкі і мастацкай культуры (У. Конан, А. Майхровіч і інш.), аналіз яе логіка-дыялектычнага зместу і структуры (М. Крукоўскі), даследаванне канкрэтна-гістарычнага выяўлення прыгожага ў літаратуры і інш. відах мастацтва (крытыка, літаратуразнаўства, мастацтвазнаўства).


*Кадр з фільма «Лясная быль»*


*Кадр з фільма «Тры талеры»*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб’яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета
Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 19.11.2020
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 548.
Тыраж 394 асобнікі.